№ 22 (572) 12 чэрвеня 2008 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі



## Іван Шыла:

Ніхто з маіх настаўнікаў не прагаласаваў за выключэньне

Старонка 9

## Шавельзон у турме

Арыштаваны вядомы прадпрымальнік і дарадца старшыні савету рэспублікі.

Старонка 3

## «Народны альбом». Пасьлясмак

Праз 10 гадоў пасьля выхаду культавага м'юзыклу п'еса паводле яго выйшла асобнай кніжкай.

Старонка 14


### У НУМАРЫ

**Дзень шосты**

«Злом савецкай школьнай сыстэмы пачнецца ўжо 1 верасьня 2008 году» . Гэтая бадзёрая фраза журналісткі ў анонсе нядзельнай праграмы АНТ «Контуры» прагучала ў эфіры столькі разоў, што сапраўды можна было паверыць — нейкі злом абавязкова адбудзецца. Піша Віталь Тарас. **Старонка 6.**

**Мядзьведзеў пабаяўся сапсаваць імідж?**

На нефармальным саміце ў Пецярбургу новы расейскі прэзыдэнт пагутарыў тэт-а-тэт амаль што з усімі калегамі па СНД, акрамя беларускага. Піша Аляксандар Класкоўскі. **Старонка 5.**

**Піяр на дзецях**

10-гадовая ўнучка Аляксандра Лукашэнкі Віка зьнялася ў галоўнай ролі ў камэдыі «На сьпіне ў чорнага ката». **Старонка 3.**

**Хрэсьнікі Масьціцкага**

Нядаўна адзін стары чалавек распавёў мне, што некалі, за панскай Польшчай быў ён «хрэсьнікам Масьціцкага». Піша Руслан Равяка. **Старонка 5.**

**Трое з запасьнікоў**

Мастацтва левай Эўропы ў Нацыянальным музэі. Піша Сяргей Харэўскі. **Старонка 15.**


# Месяц футболу

Герой гішпанцаў Давід Вілья забіў тры галы ў вароты зборнай Расеі. Эўра—2008 — **старонка 13.**



# Апазыцыі трэба перагледзець мэты

Лукашэнка, пры ўсёй эксцэнтрычнасьці і дзікасьці ягоных палітычных манер і мовы, усё ж закладае падмурак, які перажыве ягонае праўленьне. Піша Ян Максімюк.

Мне цяжка прыгадаць каго-небудзь зь лідэраў сучаснай беларускай апазыцыі, хто б не займаў таго ці іншага прыметнага становішча ў палітычным, сацыяльным або культурным жыцьці Беларусі да ліпеня 1994 году, калі да ўлады прыйшоў прэзыдэнт Аляксандар Лукашэнка.

Станіслаў Шушкевіч у той час, калі Лукашэнка пачаў сваю палітычную кар'еру, быў старшынём Вярхоўнага Савету Беларусі, і менавіта Шушкевічаў подпіс стаіць пад пагадненьнямі, якія пазначылі сабой канец Савецкага Саюзу. Лявон Баршчэўскі зь Беларускага Народнага Фронту ў 1991—95 г. быў дэпутатам ВС разам са сваімі паплечнікамі Зянонам Пазьняком і Юрасём Беленькім. Анатоль Лябедзька, лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі, таксама быў дэпутатам ВС таго самага скліканьня. Сацыял-дэмакрат Аляксандар Казулін быў намесьнікам міністра адукацыі ва ўрадзе Вячаслава Кебіча. Другі сацыял-дэмакрат Мікола Статкевіч быў заснавальнікам Беларускага згуртаваньня вайскоўцаў. Мабыць, толькі Аляксандар Мілінкевіч быў у далукашэнкаўскую эпоху амаль невядомы, займаючы пасады ўніверсытэцкага выкладчыка і намесьніка старшыні Гарадзенскага гарвыканкаму.

Праз чатырнаццаць год, пасьля сэрыі маштабных палітычных няўдачаў, мы бачым на чале беларускай апазыцыі практычна тых самых людзей. Але калі чатырнаццаць год таму гэтыя палітыкі маглі мабілізаваць у Менску на вулічныя акцыі пратэсту супраць рэжыму 50 000 чалавек, дык сёньня і 2000 лічацца вялікім посьпехам. «Канфлікт пакаленьняў» паміж апазыцыйнымі лідэрамі-«вэтэранамі» і маладымі беларусамі зьяўляецца адной з істотных прычынаў выключнай слабасьці сучаснай беларускай апазыцыі. Хоць можна таксама сьцьвярджаць, што ня менш важныя прычыны маргіналізацыі апазыцыйнага руху і нават зьвядзеньня яго да ролі савецкага дысыдэнцтва палягаюць у адсутнасьці адэкватнай палітычнай стратэгіі з боку апазыцыі і здольнасьці рэжыму сяк-так патрапляць асноўным патрэбам ды чаканьням моладзі.

**Працяг на старонцы 9.**

## Састарэлая апазыцыя

Сярэдні ўзрост кіраўніцтва ўсіх партыяў, акрамя партыі БНФ, перавышае 50 гадоў. Прычым ён павялічваецца пры пераходзе ад правага краю палітычнага спэктру да левага. Ва ўсіх разгляданых партыях нязначную праслойку складаюць сябры партыяў векам ад 35 да 45 год. Гэта можа быць сьведчаньнем адсутнасьці пераемнасьці ў партыйнай традыцыі праз вымываньне вельмі важнай узроставай катэгорыі, якая складаецца з найбольш самастойных, прафэсійных і мэтаскіраваных людзей на піку творчых магчымасьцяў. Піша Дзяніс Мельянцоў. **Старонка 8.**

АД РЭДАКЦЫІ

## Гравюра Цюнта і ўлады

Трэба ацаніць унікальнасьць падзеі: гарвыканкам паслаў паўнамоцнага прадстаўніка, каб паспрабаваць купіць сярэднявечную гравюру. Піша **Сяргей Астравец**.

Вынікі таргоў у Варшаве вядомыя: гравюра Матыяса Цюнта, дзякуючы якой мы ведаем, якой некалі была Горадня, засталася ў Польшчы. Але важна, што мы таксама спрабавалі яе набыць. Мы, мужыкі-беларусы, паны сахі…

Сям-там давялося прачытаць, што вось, маўляў, гарадзенскі прадстаўнік езьдзіў на таргі, але грошай на Цюнта не хапіла. Нібыта як пра звычайную справу сказана: ну зьезьдзіў, ну грошай не хапіла, у палякаў жа іх болей, на такія рэчы прынамсі, усім вядома.

Крыху больш за тыдзень таму сустрэў знаёмага гісторыка, кажа: паведамілі з Варшавы, што будзе прадавацца гарадзенская гравюра, але каштуе пачаткова амаль дваццаць тысяч даляраў. Вось каб набыць яе, ды яшчэ на 880-годзьдзе, але ж у нас такое нерэальна, немагчыма, каб улады грошы далі, гэта ж не на рамонт гораду. А што да мэцэнацтва, то зь ім таксама вядомая справа ў нас.

І вось высьвятляецца, што ўлады якраз усьвядомілі каштоўнасьць гравюры, патрэбу ў ёй, магчымасьць выдаць на яе грошы. Зрэшты, гаворка, хутчэй, пра адну асобу, у якой нармальны чалавечы твар у нашыя часы! І вось жа, каб гэта загадзя ведаць пра аўкцыён, рыхтавацца, сабраць грошы, ды каб не душылася ў нас мэцэнацтва, Цюнт у нас, лічыце, у кішэні быў бы. У нас, паноў сахі!

Аднак у любым разе трэба ацаніць унікальнасьць падзеі: гарвыканкам паслаў паўнамоцнага прадстаўніка, каб паспрабаваць купіць сярэднявечную гравюру ў іхнай натаўскай Польшчы… Тэктанічны зрух напросту адбыўся, ледавік, ня ведаю, пачаў таяць ці папоўз назад.

Людзі: увіцце, мы тут ходзім паміж суцэльнымі рамонтамі гістарычнай забудовы гадамі, шкадуем выдзерты брук, вялізныя камяні зь сярэднявечных падмуркаў, бардзюры з кляймом магістрату, а тут раптам улады ня супраць раскашэліцца не на цэмэнт, не на граніт, як звычайна, а на адбітак XVI стагодзьдзя! Штось псыхалягічна зрушылася, не інакш. І ім прыемна, што яны не такія адсталыя, і нам — што не такія безнадзейныя яны. Праўда, прыемнасьць гэта бяз вынікаў, усё роўна, што спрабаваць уявіць сабе смак кавы, ня маючы магчымасьці атрымаць кубак яе.

*Горадня*

# Што ў сабе хавае новы навучальны год

З 1 верасьня беларуская школа вяртаецца да 11-гадовай сыстэмы навучаньня. У рамках рэформы прадмет «Гісторыя Беларусі» будзе абʼяднаны з «Сусьветнай гісторыяй». Шэраг прадметаў проста зьнікне, як і профільнае выкладаньне ў звычайных школах.

**«Пэдагагічны сьверб рэфарматарства»**

Старт рэформе даў намесьнік кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Анатоль Рубінаў, які на пачатку сакавіка ў артыкуле «Пэдагагічны сьверб рэфарматарства», надрукаваным у газэце «Советская Белоруссия», рэзка раскрытыкаваў 12-гадовую сыстэму адукацыі. Вынікам стала рашэньне А.Лукашэнка.

**Што ў сабе хавае новы навучальны год**

У рамках рэформы прадмет «Гісторыя Беларусі» будзе абʼяднаны з «Сусьветнай гісторыяй», а курсы «Айчынная і сусьветная мастацкая культура» і «Асновы бясьпекі жыцьцядзейнасьці» з 1 верасьня ўвогуле зьнікнуць са школьнай праграмы. Акрамя таго, курс «Чалавек. Грамадзтва. Дзяржава» будзе пераўтвораны ў «Грамадазнаўства», якое будуць выкладаць, пачынаючы з 9 клясы.

Прадметы «Музыка» і «Выяўленчае мастацтва» лякалізуюць у межах пачатковай школы (між тым лічыцца, што менавіта яны апасродкавана найменш разьвіваюць асобу), а працоўнае навучаньне і крэсьленьне абʼядноўваюць у дысцыпліну «Працоўнае навучаньне. Крэсьленьне».

Ліцэйскія і гімназічныя клясы ў звычайных сярэдніх школах зьнікнуць, як і самі школы з паглыбленым вывучэньнем пэўных прадметаў. Пры гэтым захаваюцца ўласна ліцэі і гімназіі, кантроль за паступленьнем у якія, паводле словаў А.Лукашэнкі, «трэба ўсталяваць такі ж строгі, як і пры арганізацыі прыёму ў ВНУ». Захаваюцца таксама школы з эстэтычным і спартовым ухілам. У праграме застануцца факультатыўныя заняткі, якія будуць наведвацца школьнікамі добраахвотна пасьля асноўных.

Зь верасьня ўсе навучальныя ўстановы сярэдняй адукацыі пераходзяць на пяцідзённае навучаньне. Навучальны год падоўжыцца на адзін тыдзень — да чэрвеня, а працягласьць астатніх вакацыяў ня зьменіцца.




**Лукашэнкаўцы лічаць, што для патрэбаў прамысловасьці 11-годкі досыць, а мастацкае адукацыі і веданьня гісторыі Беларусі — залішне.**

**«Рэформа ў пячорны век»**

Будучая рэформа выклікае захапленьне не ва ўсіх, а нязгодныя зь ёй ёсьць і сярод прадстаўнікоў улады. Так, старшыня камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе палаты прадстаўнікоў Уладзімер Здановіч незадаволены пасьпешлівасьцю, зь якой ладзіцца чарговая рэформа адукацыі, скарачэньнем колькасьці прадметаў. Паводле яго, новая рэформа «вядзе ў пячорны век».

Вынікам зьменаў можа стаць значнае скарачэньне настаўнікаў. Паводле прафсаюзу працаўнікоў адукацыі, працу могуць страціць 20—30 тысяч чалавек. Праціўнікі рэформы мяркуюць, што спрашчэньне навучальнай праграмы і ліквідацыя профільных клясаў паставіць у няроўнае становішча навучэнцаў звычайных школаў і гімназіяў. Таксама выказваецца засьцярога за будучыню выкладаньня гісторыі Беларусі.

**Сямён Печанко**

## Менск — апошні ў Эўропе

Менск займае найніжэйшае сярод эўрапейскіх гарадоў месца ў сьвеце паводле якасьці жыцьця. Такія вынікі дасьледаваньня міжнароднай кампаніі «Мэрсэр». Дасьледаваньне праводзілася ў больш чым 200 гарадах сьвету. На першым месцы ўжо другі год запар Цюрых, другое падзяляюць Вена і Жэнэва.

Сярод усходнеэўрапейскіх гарадоў наперадзе — Прага (71-е месца). Вільня — на 78-м, Варшава — на 85-м, Рыга — на 89-м.

Менск займае 183-е месца — найніжэйшае з усіх гарадоў Эўропы.

Пры ацэнцы якасьці жыцьця ўлічваліся: палітычная стабільнасьць, павага закону і прававая абароненасьць людзей, узровень жыцьця, ступень сацыяльных і палітычных свабодаў, ахова здароўя, стандарты адукацыі, якасьць паслуг (праца грамадзкага транспарту, заторы на дарогах і г. д.), адпачынак (рэстараны, тэатры і г. д.), забясьпечанасьць жытлом, чысьціня прыроднага асяродзьдзя.

**Шаноўныя людзі!**

«Наша Ніва» шукае распаўсюднікаў для продажу газэты на вуліцах і ў электрычках. Справа выгадная і надта патрэбная.

Продаж ажыцьцяўляецца на аснове дамоваў.

Зьвяртацца праз тэл.:
(017) 284–73–29,
(029) 260–78–32,
(029) 618–54–84

СЬЦІСЛА

**Пад гарачым сонцам**

Восем чалавек сабраліся ля будынку Міністэрства адукацыі з расьцяжкай «Школа для ўсіх». Гэтак яны пратэставалі супраць палітычна матываванага выключэньня са школы Івана Шылы ў Салігорску.

**Інтэрактыўная ТВ**

РУП «Белтэлекам» завяршае падрыхтоўчыя работы па ўвядзеньні ў эксплюатацыю першае сеткі інтэрактыўнага тэлебачаньня. Масавыя продажы IP-TV пачнуцца ў Менску ўжо летам і, напэўна, ўдараць па дзейных апэратарах эфірна-кабэльнага тэлебачаньня. Кошт 30-дзённай падпіскі на IP-TV будзе складаць 15—20 даляраў. Пры гэтым «Белтелекам» мае намер прапанаваць у тры разы больш каналаў, чым, напрыклад, «Космас-ТВ». Падключыцца да інтэрактыўнага тэлебачаньня змогуць практычна ўсе карысталькі стацыянарнай тэлефоннай сувязі. Дастаткова толькі ADSL-мадэму і дэкодэра Set Top Box.

**ЗША і ЭС адзіныя ў беларускім пытаньні**

ЗША і Эўрасаюз асуджаюць дзеяньні афіцыйнага Менску ў дачыненьні да дыпляматычных місій. Пра гэта гаворыцца ў заяве па выніках саміту ЗША-Эўрасаюз, які адбыўся ў славенскім горадзе Брдо.

**Мядзьведзеў і Лукашэнка сустрэнуцца**

Візыт у Беларусь расейскага прэзыдэнта заплянаваны на 22 чэрвеня. Спатканьне адбудзецца ў чэрвені.

**Памёр Чынгіз Айтматаў**

10 чэрвеня на 80-м годзе жыцьця ў адной зь нямецкіх клінік памёр пісьменьнік Чынгіз Айтматаў, клясык савецкага гуманізму. Пасьля набыцьця Кіргізіяй незалежнасьці ён быў нязьменным паслом краіны пры ЭС. Ягоныя творы «Бывай, Гульсары», «Белы параход», «Буранны паўстанак», «Плаха» чыталі мільёны людзей. Тэма чалавечага сумленьня заставалася цэнтральнай у творах пісьменьніка, чыйго бацьку рэпрэсавалі ў 1937 годзе як ворага народу. Камісію па пахаваньні «кіргіскага Быкава» меў узначаліць прэзыдэнт гэтай цэнтральнаазіяцкай краіны.

**У Калюмбіі арыштаваны вэнэсуэльскі афіцэр**

Новы пракол Уга Чавэса: улады Калюмбіі арыштавалі афіцэра вэнэсуэльскай Нацыянальнай гвардыі, які перавозіў 40 тысяч патронаў да аўтаматаў Калашнікава. Улады Калюмбіі мяркуюць, што груз прызначаўся для тэрарыстаў з арганізацыі FARC.

**МБ, ЗП**

# Арыштаваны Шавельзон

Першы намесьнік старшыні Саюзу прадпрымальнікаў быў таксама сябрам кансультатыўнай рады пры ўрадзе і дарадцам старшыні савету рэспублікі.

Літоўскі партал Delfi першым паведаміў, што арыштаваныя жыхар Вільні Гінтас Зэгерыс, які займаўся бізнэсам у Беларусі, і яго дзелавы партнёр Міхаіл Шавельзон (у тэксьце Delfi — Савелізон). Абодва знаходзяцца ў турме КДБ.

Гэта стала вядома ад былой жонкі Зэгерыса. Ілона Зэгерэне расказала, што бізнэсоўца вінавацяць у пасярэдніцтве пры даваньні хабару. Зэгерыс працаваў у Менску больш за 10 гадоў і меў від на жыхарства ў Беларусі. Пасол Літвы ў Беларусі Эдмінас Багдонас заявіў літоўскім СМІ, што пакуль ён не атрымліваў афіцыйнай просьбы суайчыньніка аб дапамозе. Прадстаўнікі пасольства змогуць наведаць Зэгерыса толькі пасьля таго, як ён сам афіцыйна зьвернецца да іх па дапамогу як грамадзянін Літвы.

Тым часам тэлефон Міхаіла Шавельзона, які зьяўляецца ганаровым віцэ-старшынём Беларускага саюзу прадпрымальнікаў, не адказвае. Першы віцэ-старшыня Саюзу прадпрымальнікаў Беларусі Рыгор Рылькоў пацьвердзіў, што сувязі з Шавельзонам няма прынамсі ад 3 чэрвеня. 3-га прадпрымальнікі тэлефанавалі калегу, каб павіншаваць яго з народзінамі, але сувязі не было.



**Міхаіл Шавельзон.**

Шавельзон быў вядомы як прадпрымальнік, кіраўнік праўленьня каапэратыву «Тэхэнэргасэрвіс». Ён намесьнік старшыні Саюзу прадпрымальнікаў. Быў дарадцам старшыні савету рэспублікі нацыянальнага сходу.

**Мікола Бугай**

# Піяр на дзецях

10-гадовая ўнучка Аляксандра Лукашэнкі Віка зьнялася ў галоўнай ролі ў камэдыі «На сьпіне ў чорнага ката». Пра гэта піша «Комсомольская правда в Белоруссии». На пытаньне, як у фільм трапіла ўнучка А.Лукашэнкі, рэжысёр карціны Іван Паўлаў адказаў: «Мяне папрасілі прагледзець на адну зь дзіцячых роляў дзяўчынку Віку Лукашэнку дзевяці гадоў. Без аніякіх умоваў, пакідаючы за мной рашэньне, браць дзіця на ролю ці ня браць. І я адказаў: «Чаго не? Хай прыходзіць».

Акрамя яе, у фільме зьняліся Філіп Кіркораў (бясплатна, на просьбу Адміністрацыі прэзыдэнта Беларусі), Валянцін Прахараў і Міхаіл Жыгалаў.



**Дзед Лёха (Міхаіл Жыгалаў) перадаў Віцы (Віка Лукашэнка) любоў да прыгодаў.**

Рука брытанскага піяр-майстра Цімаці Бэла? Хутчэй, Уладзімера Замяталіна. Майстар палітычнай прапаганды ўзначаліў «Беларусьфільм», паабяцаўшы ператварыць яго ў беларускую фабрыку мрояў. У ЗША і асабліва Азіі кіназоркі робяць палітычныя кар'еры. Чаму б не адваротнае — зьмяняць імідж праз кіно?

**МБ**

# Натальля Пяткевіч у ЗША

Намесьніца кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Натальля Пяткевіч наведала Нью-Ёрк. Яна выступіла ў ААН з дакладам у пытаньні гандлю людзьмі.

Менавіта яна летась вяла сакрэтныя перамовы з амэрыканскім бокам, якія скончыліся вызваленьнем часткі палітвязьняў. Пасьля таго яна ўжо аднойчы была ў ААН. У часе тае паездкі лукашэнкаўскі ўрад дабіваўся, каб зь ёю сустрэліся прадстаўнікі Дзярждэпартамэнту ЗША. Тады ім было адмоўлена: Вашынгтон настойваў на вызваленьні ўсіх зьняволеных для аднаўленьня дыялёгу. Пасьля гэтага здарыўся крызіс у стасунках, і Менск пачаў праводзіць палітыку з пазыцыі сілы.

**МБ**




**Натальля Пяткевіч у ААН.**

# Гульні з запалкамі

Некалькі дзясяткаў графіці «Смаленск — гэта Беларусь!» зьявіліся ў Смаленску, паведамляе прэс-служба незарэгістраванага «Маладога фронту».

Маладафронтаўцы, якія былі ў Расеі, здолелі сфатаграфаваць надпісы.

Смаленск уваходзіў у Вялікае Княства Літоўскае, у Смаленску знаходзілася першая сталіца БССР, але пасьля Сталін далучыў горад да Расеі. На сёньня на Смаленшчыне няма ніякай беларускай культурнай актыўнасьці, а доля людзей, якія лічаць сябе беларусамі, у насельніцтве рэгіёну, — мізэрная.

**Паводле mfront.net**



## Пяць праблемаў Расеі

назваў першы віцэ-прэм'ер краіны **Ігар Шувалаў** у выступе на XII Міжнародным эканамічным форуме ў Пецярбургу.

«Праблема першая — мы пакутуем псыхалёгіяй даганяючага, — сказаў Шувалаў. — Другая — энэргетычная пастка. Трэцяя — адсталыя навыкі. Чацьвертая — нездаровы лад жыцьця, і пятая — імкненьне дзяржавы да росту свайго ўплыву і імкненьне многіх прымусіць дзяржаву ўплываць», — адзначыў першы віцэ-прэм'ер і галоўны эканамічны дарадца Пуціна. Зь яго словаў, Расея сканцэнтруе ўвагу на рашэньні тых задачаў, дзе можа быць эфэктыўнай.

Бізнэсоўцы адзначылі, што прамова Шувалава была нашмат больш «прэзыдэнцкай», чым выхалашчаны сьпіч намінальнага прэзыдэнта Мядзьведзева.

**МБ**

# Пад канвоем у ваенкамат

даставілі Франака Вячорку, сына Вінцука і самога актывіста партыі БНФ.



SVABODA.ORG

Франак Вячорка паведаміў, што яго затрымалі міліцыянты, як толькі ён выйшаў з пад'езду свайго дому. Яны ўручылі яму позву ў ваенкамат і на відэакамэру здымалі, як Франак падпісвае дакумэнт.

Пасьля гэтага ў Вячоркі адабралі мабільны тэлефон і пад аховай адвезьлі ў камісарыят. Там ён меў размову з намесьнікам кіраўніка ваенкамату. Той папярэдзіў Франка, што ад паняздзелка яму будзе абмежаваны выезд за мяжу.

Франак папрасіў даслаць яму позву на хатні адрас. Ён заявіў, што прызнае яе сапраўднай толькі ў тым выпадку, калі яна будзе напісана па-беларуску.

Франка выключылі з БДУ за ягоную палітычную дзейнасьць.

**Паводле радыё «Свабода»**

## СЬЦІСЛА

### Сямашка в.а прэм'ера

Прэм'ер-міністар Беларусі Сяргей Сідорскі з 9 па 20 чэрвеня знаходзіцца ў плянавым адпачынку. Яго абавязкі ў гэты час будзе выконваць першы намесьнік прэм'ер-міністара Уладзімер Сямашка.

### Папа Рымскі падкрэсьліў эўрапейскасьць Беларусі

Папа Рымскі Бэнэдыкт XVI прыняў даверчыя лісты новага пасла Беларусі ў Ватыкане Сяргея Алейніка. Ён перадаў найлепшыя зычэньні Аляксандру Лукашэнку й блаславіў народ Беларусі. У сваёй прамове Бэнэдэкт XVI заявіў, што Сьвяты пасад «працягне падтрымку беларускага народу ў ягоным імкненьні да ўмацаваньня свабоды, у ягоным жаданьні працэс у якасьці члена вялікай сям'і свабодных і сувэрэнных эўрапейскіх краін». Каталіцкая царква ў Беларусі, пільнуючыся рымскіх і бізантыйскіх традыцый, просіць не прывілеяў, адцеміў кіраўнік Сьвятога прастолу, але магчымасьці зрабіць свой унёсак у разьвіцьцё краіны.

### БТ прынясе прабачэньні

Журналіст Юры Пракопаў у тэлефоннай размове з адвакаткай Верай Страмкоўскай папрасіў у яе прабачэньня за агалошаньне недакладных зьвестак. Гэта адбылося пасьля таго, як Страмкоўская паабяцала падаць на журналіста заяву ў суд, калі ён не абвергне заяву, што адвакатка нібыта атрымлівала грант у пасольстве ЗША.

**МБ; Марына Рахлей, naviny.by**

# Чаго хоча Расея

Расейскі пасол у Менску **Аляксандар Сурыкаў** абрысаваў расейскія задумы што да Беларусі.

### Газ: $200 у 2009-м

Цана на расейскі газ для Беларусі ў 2009 г. можа скласьці каля $200 за тысячу кубамэтраў, паведаміў пасол. Пасол ня выключыў, што жаданьне беларускага боку перагледзець кантракт выльецца ў чарговыя перамовы. Ён нагадаў пра дакладна вызначаны парадак цэнаўтварэньня і формулу цаны на газ для Беларусі да 2011 г. згодна з падпісаным у канцы 2006 г. кантрактам паміж «Газпромам» і «Белтрансгазам». І падкрэсьліў: «У Беларусі ня будзе заходнеэўрапейскай цаны на газ, але яго цана можа быць дастаткова высокай. Да 2011 г. газ можа каштаваць $400 і больш».

Варта адзначыць, што лічба, агучаная расейскім пaслом, супадае з дадзенымі афіцыйнага сайту «Газпрому», які налета плянуе прадаць Беларусі 22,1 млрд. кубамэтраў газу на $4,42 млрд.

Тым часам, расейскі газ для ўкраінскіх спажыўцоў з 1 студзеня 2009 г. можа падаражэць удвая. Пра гэта 6 чэрвеня заявіў міністар замежных справаў Расеі Сяргей Лаўроў, распавядаючы пра вынікі сустрэчы прэзыдэнтаў Мядзьведзева і Юшчанкі. На сёньня Украіна набывае ў Расеі імпартны газ па $179,5 за тысячу кубамэтраў.

У сваю чаргу, віцэ-прэм'ер беларускага ўраду Кабякоў пасьпяшаўся нагадаць, што дзякуючы асаблівым стасункам з Масквой газ для Беларусі будзе каштаваць на 30% таньней, чым для суседніх краінаў за кошт неабкладаньня падаткам на экспарт.

### Крэдыт: Дамо, але нашто?

Са словаў расейскага пасла, Мінфіны Беларусі і Расеі вывучаюць магчымасьць выдзяленьня нашай краіне чарговага расейскага крэдыту памерам $2 млрд. Апошні стабілізацыйны крэдыт аб'ёмам $1,5 млрд Беларусь атрымала ад Расеі ў сьнежні мінулага году. Ужо ў студзені 2008 г. першы намесьнік міністра фінансаў Беларусі Андрэй Харкавец заявіў пра зацікаўленасьць беларускага боку ў прыцягненьні чарговага крэдыту на $2 млрд. Паводле яго, «першы расейскі дзяржкрэдыт Беларусь атрымала на вельмі выгадных умовах». А.Сурыкаў на апошняй прэс-канфэрэнцыі заявіў, што расейскі бок ня супраць вылучыць такі крэдыт, але «павінен ацаніць мэтазгоднасьць яго вылучэньня».

Варта адзначыць, што напярэдадні травеньскага саміту кіраўнікоў урадаў СНД у Менску расейскія СМІ, са спасылкай на «крыніцу ў расейскім урадзе»,



распаўсюдзілі інфармацыю пра гатоўнасьць Расеі абмеркаваць новы льготны крэдыт для Беларусі на аплату газу. Узамен беларускаму боку прапаноўвалася падзяліцца з расейскімі інвэстарамі чарговай порцыяй прывабных актываў, на гэты раз — прадпрыемствамі машынабудаваньня.

### МАЗ: Створыць СП з расейскім «Уралам»

Кааперацыя ў машынабудаўнічай сфэры, на думку пасла Расеі, дапаможа расейскім і беларускім вытворцам пазьбегнуць канкурэнцыі. Паводле ягоных словаў, дзеля гэтага Расея прапануе аб'яднаць актывы МАЗу, РусАвто, КАМАЗу. Раней расейская газэта «КоммерсантЪ» паведаміла пра магчымы варыянт такой кааперацыі. Паводле выданьня, беларускія ўлады гатовыя прыняць прапанову Алега Дзерыпаскі пра інтэграцыю Менскага аўтазаводу і расейскага «Уралу» пры ўмове стварэньня сумеснага прадпрыемства на парытэтных пачатках. Бакі нібыта мяркуюць стварыць СП пад назовам Міжнародны фінансава-прамысловы саюз (МФПС).

Пасьля акцыянаваньня МАЗу беларускі бок укладзе ў СП 100% уласных акцыяў, а канцэрн «Расейскія машыны», што зьяўляецца ўласьнікам «Уралу» — 100% акцыяў апошняга. У аб'яднанай кампаніі партнёры атрымаюць 40% і 35% акцыяў адпаведна, а рэшту прапануюць міжнароднаму інвэстбанку, які вылучыць сродкі на разьвіцьцё заводаў.

На думку аналітыка «Банка Москвы» Міхаіла Ляміна, МФПС ацэньваецца на $3,5—3,7 млрд, зь якіх каля $1,5 млрд прыйдзецца на МАЗ і $1—1,1 млрд на «Урал», а рэшта будзе ўнёскам інвэстбанку.

### Новыя праекты «Газпрому»

ААТ «Газпром» і ААТ «Белтрансгаз» могуць рэалізоўваць новыя праекты супрацоўніцтва, упэўнены пасол Расеі. У прыватнасьці, «Газпром» можа паўдзельнічаць у будаўніцтве новага комплексу ў ААТ «Гродня-Азот», а таксама прапанаваць супрацоўніцтва ў галіне разьвіцьця падземных газасховішчаў, у электраэнэргетычнай галіне Беларусі.

Беларускім і расейскім вытворцам цукру пасол Сурыкаў таксама прапанаваў аб'яднаць актывы. Прапанова мае выразны прысмак шантажу: калі Беларусь прымае яе, то бакі ўсталююць для абедзьвюх краінаў адзіную цану; у адваротным выпадку налета беларускі бок атрымае ранейшую квоту на пастаўкі цукру ў Расею.

### АЭС: «Атомстройэкспорт» атрымала прапанову

Прапановы Беларусі ўдзельнічаць у пабудове АЭС атрымалі расейская кампанія «Атомстройэкспорт», француская Areva і амэрыкана-японская Westinghouse-Toshiba.

Пасол Сурыкаў выказаў меркаваньне, што ў выніку такую прапанову прыме толькі адна кампанія. Варта адзначыць, што ў справе пабудовы першай беларускай АЭС дагэтуль няма пэўнасьці ў пытаньні выбару пляцоўкі і стратэгічнага інвэстара праекту. Тым ня менш, расейцы ад самага пачатку выказвалі зацікаўленасьць да праекту, і, зважаючы на неаднаразовыя заявы свайго пасла, не губляюць надзеі і цяпер.

### Расейскі капітал: Што ж, чакайце ў госьці нас...

Падзяліўшыся плянамі і прапановамі Расеі, пасол Аляксандар Сурыкаў назваў галоўную сілу, што стрымлівае актыўны прыток расейскага капіталу ў беларускую эканоміку. Паводле ягоных словаў, чым больш Беларусь будзе дэманстраваць лібэралізацыю свайго заканадаўства, тым «больш магутным будзе рух расейскага капіталу ў Беларусь».

**Сямён Печанко**

## СЬЦІСЛА

### Падаражэлі бэнзін і дызпаліва

ў сярэднім на 5 і 15% адпаведна. Цяпер раздробавыя цэны на нафтапрадукты складаюць: бэнзін А-76 («Нармаль-80») — 1760 руб/л (+90 руб.), бэнзін АІ-92 — 2230 (+110 руб.), бэнзін АІ-95 — 2540 (+120 руб.), дызпаліва 1940 руб/л (+250 руб.).

Тым часам цана нафты на сусьветным рынку набліжаецца да парогу 150 даляраў.

### Полацкія азёры пераходзяць у прыватныя рукі

Усё больш азёраў бяруць у арэнду фэрмэрскія гаспадаркі Полаччыны. Цяпер у арэндзе знаходзіцца 13 азёраў, яшчэ адно чакае свайго — ідзе афармленьне дакумэнтаў. Усяго на Віцебшчыне больш за трыста азёраў.

### «Газпром»: Нафта падаражэе да 250 даляраў

Пра гэта на штогадовым сходзе Эўрапейскага дзелавога кангрэсу ў Францыі паведаміў старшыня расейскага «Газпрому» Аляксей Мілер. Ён, аднак, не сказаў, калі тое падаражэньне адбудзецца. Адмыслоўцы мяркуюць, што прагноз Мілера можа збыцца ўжо налета. Сярэдняя экспартная цана расейскага газу ў Эўропе, паводле заявы А.Мілера, дасягнула $410. Паводле ягоных словаў, нават «Газпром», які валодае падрабязнай інфармацыяй пра цэны на газавым рынку, недаацаніў пэрспэктываў росту цэнаў на газ.

### «Гарызонт» распрацаваў прымачы для талерак

Адмыслоўцы прыватнага навукова-дасьледчага ўнітарнага прадпрыемства «Інстытут лічбавага тэлебачаньня «Гарызонт» распрацавалі прымач спадарожнікавага вяшчаньня для пэрсанальнага кампутара. Навінка прызначаная для прыёму сыгналаў спадарожнікавага сеціва, а таксама спадарожнікавага радыё і тэлебачаньня, у тым ліку HDTV-вяшчаньня. Прымач сумяшчальны з многімі сучаснымі праграмамі прагляду тэлевізійнага вяшчаньня — ProgDVB, MyTheatre ды інш. Сэрыйная вытворчасьць новай прадукцыі плянуецца ўжо сёлета.

### У Эўропе — працоўны тыдзень да 65 гадзінаў

Як і раней, тыдзень працы ў краінах Эўрасаюзу будзе складаць да 48 гадзінаў, а са згоды працаўніка яго можна будзе падаўжаць максымум да 65 гадзінаў — пастанавілі міністры працы ЭС на сустрэчы ў Люксэмбургу. Варта адзначыць, што нацыянальныя заканадаўствы большасьці краінаў больш строгія і абмяжоўваюць працоўны тыдзень 40 ці нават 35, як у Францыі, гадзінамі.

**СП; паводле БелаПАН, БЕЛТА, Gazeta.pl**




PHOTO.BYMEDIA.NET

# Мядзьведзеў пабаяўся сапсаваць імідж?

На нефармальным саміце ў Пецярбургу новы расейскі прэзыдэнт пагутарыў тэт-а-тэт амаль што з усімі калегамі па СНД, акрамя беларускага. Піша **Аляксандар Класкоўскі**.



Яўгенія Войка з Цэнтру палітычнай кан'юнктуры Расеі (гэтая аналітычная структура лічыцца блізкай да Крамлю) мяркуе: паколькі Мядзьведзеў для Захаду хоча выглядаць лібэралам, то «з улікам абвастрэньня беларуска-эўрапейскіх дачыненьняў ён рызыкаваў бы дэзавуяваць свой лібэральны імідж у выпадку перамоваў з Лукашэнкам» у вачох удзельнікаў міжнароднага эканамічнага форуму, што распачаўся ў Пецярбургу паралельна.

Вэрсія, магчыма, лье бальзам на душу палітычным працаўнікам Лукашэнкі, але падаецца занадта прыгожай. Новы расейскі прэзыдэнт пагутарыў сам-насам, напрыклад, з Карымавым, у якога рэпутацыя на Захадзе, асабліва пасьля андыжанскай бойні, таксама спэцыфічная. Дый у шэрагу іншых постсавецкіх краін дэмакраты нягуста. Так што падыход да кантактаў быў, бадай, прагматычны. Туркмэністан, Азэрбайджан — гэта энэрганосьбіты, пытаньні іх транзыту, так што і для Бэрдымухамэдава, і для Аліева час у новага гаспадара Крамлю знайшоўся. Зь іншага боку, трэба было трохі напружыць Грузію ды Украіну. Таму Саакашвілі атрымаў мэсыдж, што НАТО яго не ўратуе, а Юшчанка — што намер выціснуць з Севастопалю расейскі флёт адгукнецца Кіеву газам аж па 400 даляраў (болей, чым плацяць прыбалты!) ужо з новага году.

Як бачым, кантакты адбыліся і з пэрспэктыўнымі, багатымі нафтаю ды газам партнэрамі, і з тымі, з кім Масква цяпер на нажах. Лукашэнка ж на сёньня, як у той песьні Высоцкага, «и не друг, и не враг, а так». З багатымі на энэрганосьбіты партнэрамі можна дамовіцца, празаходніх ворагаў — трохі папалохаць, у стасунках жа Масквы зь Менскам павісла доўгая паўза. Выглядае на тое, што расейская эліты чакаюць, каб бедная энэргарэсурсамі рэспубліка падзялілася тым, што мае. Актывамі прадпрыемстваў, банкаў. Каб пусьціла ў сваё фінансавае ўлоньне расейскі рубель.

Расейскі палітоляг Андрэй Рабаў без эківокаў кажа: каменем спатыкненьня сталі «пытаньні, што тычацца правоў беларускіх элітаў, якія ўзначаліі прыватызацыю. Так, натуральна, ім не хацелася б застацца ні з чым на руках у сваёй уласнай краіне. Яны выдатна разумеюць норавы расейскага бізнэсу, разумеюць, што мы забярэм усё».

Так што Масква, бадай, ня столькі баіцца сапсаваць імідж, колькі прымерваецца, як ямчэй ухапіць. Чакае, каб «кліент сасьпеў». Лічыць, што час гуляе на яе. І асабліва цяжкія часы для Беларусі могуць настаць тады, калі будуць выбітыя транзытныя козыры. Трубы ўжо агінаюць сінявокую рэспубліку зь незгаворлівым кіраўніцтвам.

# Хрэсьнікі прэзыдэнта

Нядаўна размаўляў з адным старым чалавекам. Падчас гутаркі той распавёў, што некалі, за панскай Польшчай, быў ён «хрэсьнікам Масьціцкага». Піша **Руслан Равяка**.

Што б ні рабілася дзяржаваю, але дзяцей нараджаецца вобмаль, зьмяншэньне колькасьці грамадзян Беларусі мае ўстойлівы характар. Нашыя суседзі Украіна і Расея сплочваюць бацькам добрыя грошы за нараджэньне сваіх маленькіх грамадзянаў. У нас такога пакуль нямашака, нягледзячы на гаспадарчыя перамогі.

Нядаўна размаўляў з адным старым чалавекам. Падчас гутаркі той распавёў, што некалі, за панскай Польшчай, быў ён «хрэсьнікам Масьціцкага». На мой зьдзіўлены погляд патлумачыў. Калі Ігнат Масьціцкі стаўся прэзыдэнтам Польшчы ў 1926 годзе, дык выдаў дэкрэт, згодна зь якім ён будзе хросным бацькам кожнага сёмага сына ў сям'і. Адзінай умовай было тое, што радзіна павінна быць хрысьціянскай і ня мець судзімасьцяў. Гэта працягвалася да вайны 1939 году. За 13 год Масьціцкі пахрысьціў гэтак больш за 500 хлопцаў.

Акрамя гонару мець за хроснага бацьку самога прэзыдэнта, сёмаму сыну належалі шматлікія іншыя перавагі. Найперш гэта досыць вялікая сума грошай на рахунку ў польскім банку. Якая клалася па нараджэньні й выдавалася з адсоткамі паўналетняму. Мелі хрэсьнікі й прывілеі бясплатнай навукі ў краіне ды за мяжой у любых навучальных установах, стыпэндыю, бясплатны праезд і лекаваньне.

Чалавек скардзіўся, што ўсе ягоныя льготы ляснулі разам з Другой Рэччу Паспалітай у верасьні 1939 году. Скарыстацца напоўніцу ён імі не пасьпеў, бо быў яшчэ падшыванцам. Асабліва бедаваў па грошах, што ляжалі на рахунку. Па паўналецьці мусіў атрымаць некалькі тысяч злотых. Пуд жыта тады каштаваў 2 злотых.

Стары цікавіўся, мо, магчыма, сучасная Польшча аднавіла тыя льготы, мо сплочвае нейкія грошы, тым хто не пасьпеў іх атрымаць. Бо ж большасьць хрышчоных Масьціцкага не пасьпелі вырасьці й атрымаць грашовую падтрымку.

Зразумела, сёньня ня той час. Тады сямёра дзяцей у сям'і было нормай, а калі Бог даваў іх усіх сынамі, дык тады й польская дзяржава нечым дапамагала.

Мажліва, і нам трэба ўвесьці нешта такое незвычайнае. Мо і быў бы эфэкт для нараджальнасьці, каб кожнае пятае дзіця ў сям'і хрысьціў прэзыдэнт ды гарантаваў бясплатную адукацыю, праезд па Беларусі, мэдычнае страхаваньне і 1000 эўра на рахунку.

*Баранавічы*

# Старшыня Рады БНР адказвае на пытаньні «НН»

На размову з старшынёй Рады БНР Івонкай Сурвілай я меў усяго дзесяць хвілін. Наша сустрэча адбывалася ў Варшаве напярэдадні другога працоўнага дня на канфэрэнцыі «Зьмена пакаленьняў? Або беларускія адрознасьці ў мэтах, стратэгіі й каштоўнасьцях». Спадарыня Прэзыдэнт, як называлі яе многія ўдзельнікі канфэрэнцыі, была нарасхват. І сапраўды, ня так часта выпадае сустрэцца і паразмаўляць асабіста з чалавекам, які праз палітыку беларускіх уладаў ужо шмат гадоў ня можа наведаць Бацькаўшчыну.



**«Наша Ніва»: Як Вам з-за мяжы падаюцца падзеі, што адбываюцца ў Беларусі? Ці маеце Вы нейкія надзеі, што нешта ў краіне можа зьмяніцца?**

**Івонка Сурвілла:** Ведаеце, я знаходжуся ў такой самай сытуацыі, як вы ўсе ў Беларусі. Маё ўражаньне, адчуваньне, што нешта ў нашай краіне абавязкова павінна зьмяніцца. Мне відавочна, што ўлады вельмі моцна баяцца. Баяцца актыўнасьці беларусаў. Адбываюцца рэчы, якія цяжка зразумець. Маленькая рэч — малады чалавек выходзіць на вуліцу са сьцягам ці расьціжкай, яго арыштоўваюць, яго судзяць. І робяць гэта паказальна, каб на вуліцу не выходзіла яшчэ большая колькасьць людзей. Здаецца, што ўлады альбо нешта ведаюць, чаго ня ведаем мы, альбо нешта прадчуваюць. Я думаю, што прыйдзе момант, калі нават наш цярплівы народ скажа «хопіць».

**«НН»: На Ваш погляд, ці магчымая ў будучыні трансфармацыя Рэспублікі Беларусь у Беларускую Народную Рэспубліку?**

**ІС:** Чаму б і не? Імя Беларускай Народнай Рэспублікі мы захавалі вельмі прыгожае і чыстае. І тое, што рабілася ў 1918 годзе і пазьней, было вельмі станоўчым і добрым. Таму я не была б зьдзіўленая такому разьвіцьцю падзеяў. Але гэта залежыць цалкам ад волі беларускага народу.

**«НН»: Як Вы ацэньваеце стан беларускай эміграцыі?**

**ІС:** Як казаў Вячка Станкевіч, цяпер у гэтай сфэры адбываюцца зьмены. На жаль, не заўсёды ў лепшы бок. Проста большая частка новай эміграцыі ня ёсьць нацыянальнай сьведамай. І толькі частка далучаецца да старэйшай эміграцыі і ўключаецца ў супольную працу на карасьць Беларусі. Хаця і ёсьць і адваротныя прыклады. Так, Згуртаваньне беларусаў Канады знаходзіцца абсалютна ў руках новай хвалі эмігрантаў. У Нью-Ёрку ёсьць таксама маладзевыя арганізацыі. Але сярод сотняў тысяч людзей, хто выехаў, бальшыня не ўключаецца ў нашу справу.

**«НН»: Але, мабыць, падобная сытуацыя была і сярод Вашага пакаленьня эмігрантаў?**

**ІС:** Так, у нас таксама далёка ня ўсе перайшлі да беларускай справы, але тыя, што перайшлі, былі настолькі адданымі, разумелі важнасьць супольнага жыцьця і змаганьня, што былі вельмі шчодрыя. Гэта дзякуючы ім пабудаваліся і цэрквы, і культурныя цэнтры. Часам дастаткова малой групы вельмі актыўных, каб сабраць вакол сябе вельмі шмат людзей. Так было пасьля Другой сусьветнай вайны. У цяперашняй хвалі эміграцыі шмат хто думае толькі пра сябе, але не пра беларускія справы.

**«НН»: Пры якой умове Рада БНР можа перадаць свае паўнамоцтвы беларускаму ўраду на мэтраполіі?**

**ІС:** Мы толькі гэтага чакаем. Гэта было б найбольшым нашым шчасьцем. Мы перададзім свае паўнамоцтвы толькі ў тым выпадку, калі будзем пэўныя, што Беларусь ужо ніколі ня страціць незалежнасьць.

**«НН»: Спн.Івонка, ці бачыце Вы сярод беларускіх палітыкаў таго, хто мог бы стаць лідэрам нацыі і заняць крэсла прэзыдэнта?**

**ІС:** Я не хачу адказваць на гэтае пытаньне. Мы абсалютна аднолькава трактуем усіх змагароў за незалежнасьць Бацькаўшчыны. Я маю вялікую веру ў беларускіх палітыкаў. Я захапляюся іхнымі чалавечымі якасьцямі.

**«НН»: Чым Вы сёньня яшчэ займаецеся, апроч грамадзка-палітычнай дзейнасьці?**

**ІС:** Няма ні на што часу. Ні на ўнукаў, ні на мастацтва. Спрабую неяк адкласьці тры гадзіны на тыдзень, каб хоць рука не забылася, што такое маляваць (сьмяецца). Быць старшынёй Рады БНР вельмі складаная і адказная праца. Часам прачынаесься ўначы і аб чым думаеш? Аб праблемах, якія трэба вырашаць.

**«НН»: Ці будзеце Вы вылучацца на наступны тэрмін старшынства ў Радзе?**

**ІС:** Гэтага я дакладна яшчэ ня ведаю. Выбары пройдуць у наступным годзе. Мой век ужо ня вельмі малады. Я ўяўляю на гэтай пасадзе толькі энэргічнага чалавека, які будзе нешта рабіць. Калі быў хтосьці, хто б мог пераняць мае паўнамоцтвы, то я б з радасьцю перадала іх.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**
**Варшава**

# Дзень шосты

Піша Віталь Тарас.

«Злом савецкай школьнай сыстэмы пачнецца ўжо 1-га верасьня 2008 году». Гэтая бадзёрая фраза журналісткі ў анонсе нядзельнай праграмы АНТ «Контуры» прагучала ў эфіры столькі разоў, што сапраўды можна было паверыць — нейкі злом абавязкова адбудзецца.

## Бацькі за дзяцей не адказваюць

Але ж і пытаньняў узьнікае шмат. Чаму толькі цяпер, праз 17 гадоў пасьля краху Савецкага Саюзу, вырашана адмовіцца ад савецкай сыстэмы ў беларускай школе? І на чым будуць палягаць тыя зьмены? На тым, што фармальна будзе ўведзеная пяцідзёнка, а насамрэч, на шосты дзень, у суботы, дзеці ўсё адно будуць хадзіць у школу — на абавязковыя фізру і палітзаняткі?

Дык гэта ж ужо было. Прычым тут рэформа? А можа, яна палягае на тым, што гісторыя Беларусі ў школе больш ня будзе самастойным прадметам, а будзе вывучацца толькі ў рамках усясьветнай гісторыі? Такога, сапраўды, не было нават за савецкім часам. (Тады выкладалася гісторыя БССР.) Наконт выкладаньня мовы й літаратуры пытаньняў даўно нават не ўзьнікае.

А можа, сутнасьць зьменаў зводзіцца да таго, што кожнага празьмерна актыўнага, з гледзішча настаўнікаў, вучня можна будзе выкінуць са школы, ня даўшы яму здаць экзамэн — як гэта здарылася з Іванам Шылам?

Дык дзеля гэтага ня трэба было распрацоўваць новыя праграмы ды «мэтадычкі». Дастаткова загадаў (хай сабе вусных), спушчаных зьверху. А настаўнікаў, пазбаўленых сумленьня, хопіць.

Гэта ўсё былі рытарычныя пытаньні. А ёсьць жа яшчэ і чыста практычныя. Напрыклад — што будзе са школьнікамі, якія навучаліся паводле 12-гадовай праграмы і якія сёлета скончылі 10 клясаў? Яны, відаць, цяпер мусяць за год прайсьці праграму двух гадоў. Менавіта «прайсьці», бо словы «засвоіць веды» тут яўна не падыходзяць. Хіба толькі ўзровень гэтых ведаў будзе паніжаны да ўзроўню сярэдніх клясаў.

Кажуць, што ня будзе хутка ні ліцэяў, ні гімназіяў. Адукацыя будзе сапраўды сярэдняй, але затое — усеагульнай, аднолькавай і роўнай для сельскай школы і для гарадзкой. Трыюмф сацыяльнай роўнасьці. Такая задача — сьцерці мяжу паміж горадам і вёскай — была пазначана, між іншага, у падручніках грамадазнаўства і навуковага камунізму. Ці не прыйшоў час увесьці зноў усеагульны курс навуковага камунізму як апошняй і найвышэйшай стадыі злому савецкай адукацыйнай сыстэмы?

Насамрэч не да іроніі. Няма сэнсу задавацца рытарычнымі пытаньнямі, пералічанымі вышэй. Бо настане 1-га верасьня, і шчасьлівыя першаклясьнікі, а разам зь імі — шчасьлівыя бацькі пойдуць у школу з кветкамі ды рознымі іншымі сьвяточнымі атрыбутамі.

Якія б рэформы ні праводзіліся ў школах ды інстытутах — бацькі гатовыя іх прыняць. А куды падзецца? Дзякуй за шчасьлівае дзяцінства нашых дзяцей. Такое самае, як было ў нас за савецкім часам. А самыя таленавітыя — дзеткі дзяржаўных чыноўнікаў і журналістаў, паедуць вучыцца за мяжу, у Эўрасаюз. Ня ўсе ж чыноўнікі патрапілі ў сьпіс неўязных. Дый дзеці, як вядома, за бацькоў не адказваюць.

## Як важна быць культурным

Кожны, напэўна, у сваім жыцьці сутыкаўся на працы альбо ў адпачынку з пэўнага гатунку людзьмі. Яны запаўняюць сабой і сваім існаваньнем усё наўкола. Прадметы іх адзеньня, цыгарэты (альбо цыгарэтны попел), недаедзеныя імі бутэрброды, нядопіткі, асадкі, паперы ляжаць на ўсіх крэслах і сталах (калі гэта офіс). Яны займаюць увесь ваш час размовамі пра сябе, сваімі праблемамі і просьбамі да глыбокай ночы (калі гэта, скажам, нумар у гатэлі). Прычым вы павінны займацца ягонымі праблемамі, як сваімі, неадкладна і без разважаньняў. Ён будзе паразытаваць на вас і вашым часе, пакуль (і калі) вы ня скажаце яму: досыць. Ці ня сыдзеце куды-небудзь.

Гэта мадэль паводзінаў дзяржавы. Прычым ня толькі таталітарнай. Любая дзяржава будзе агрэсіўна працягваць працэс экспансіі ў прасторы й часе, паразытаваць на вас, сілкавацца вашымі сокамі і здольнасьцямі, завалодваць вашым вольным часам бясконца. Проста ў дэмакратычнай дзяржаве вы можаце паслаць усе ўстановы разам зь іх правіламі распарадку й параграфамі да д'ябла і стаць, скажам, гіпі. Альбо антыглябалістам. У таталітарнай — у найлепшым выпадку, можна стаць бамжом.

Ніводная сыстэма, дарэчы, не рабілася адразу таталітарнай. І нават дыктатуры ня ўсе адразу станавіліся лютымі. Выключэньні, хіба, былі ў старажытным Рыме, дзе чарговы ўладар мог урачыста абвясьціць сябе дыктатарам. Ці падпаліць адвечны горад проста дзеля забавы, як гэта зрабіў Нэрон.

Нават Іван Жахлівы не адразу ўвеў апрычніну. Гітлер прыйшоў да ўлады ў 1933-м, а першыя лягеры сьмерці былі створаныя толькі праз восем гадоў. Сталін ішоў да працэсаў 1937-га і «асобых троек» удвая даўжэй. Паміж абвяшчэньнем КНР і «культурнай рэвалюцыяй» Мао прайшло дваццаць гадоў. А Чаўшэску, кажуць, на пачатку свайго праўленьня ўвогуле быў досыць прыемным чалавекам. Уся справа, як кажуць, у звычцы, ва ўменьні прыцярпецца. Усё ў сьвеце сканчаецца — казала ліса, зь якой зьдзіралі скуру.

На пачатку XXI стагодзьдзя абвяшчаць сябе дыктатарам лічыцца некультурным. Дый масавыя рэпрэсіі становяцца непатрэбнымі. Іх замянілі масавыя камунікацыі. «Чынгізхан з тэлеграфам» яшчэ мала адрозьніваўся ад свайго сярэднявечнага папярэдніка. А вось Чынгізхан з ракетамі, трубаправодамі і тэлевізіяй — гэта ўжо зусім іншы Чынгізхан. Яго прымаюць (як некалі Чаўшэску) у найлепшых дамах Лёндану й Парыжу. Ня кажучы пра Бэрлін.

## 25- ы кадр

Сутнасьць мэханізму тэлевізіі ня ў тым, што яно замбіруе насельніцтва праз міфічны 25-ы кадр, нібыта закладаючы нейкі код у падсьвядомасьць, як у выпадку з алькаголікамі. А ў тым, што яна замяняе сабой рэальнасьць. Яна і ёсьць адзінай рэальнасьцю ў грамадзтве, дзе адсутнічае нармальная, шматступенная сыстэма адукацыі, сыстэма сацыяльнага прасоўваньня і кар'ернага росту, якія павінны залежаць не ад поглядаў, рэлігійных перакананьняў і асабістых сувязяў, а толькі ад асабістых здольнасьцяў і ведаў. Гледзячы праграму «Панарама», дзе паказваюць звычайных людзей, якіх затрымалі каля пасольства ЗША толькі таму, што яны там апынуліся, і забралі ў іх грошы толькі на той падставе, што грошы ў іх былі пры сабе, глядач паціскае плячыма. Ён і без таго ведаў, што ў краіне пануе «беспрадзел», а калі яму яшчэ раз паказалі прыклад — значыць, так і мае быць. Калі нешта паказваюць па БТ, значыць, гэта некаму трэба. Значыць, усё ў парадку, нічога не зьмянілася. Трэба паводзіць сябе, як і раней. Нікому не паказваць сваіх сувязяў з замежнікамі. Калі і атрымліваць гранты, нават на законных падставах, дык глыбока таемна ад дзяржавы. І канечне ж, не на мэдыйныя праекты, якія так раздражняюць улады.

Можна абурацца камунальнымі службамі, даішнікамі, якія ловяць злачынцаў з дапамогай вашых аўтамашынаў, дзе вы самі седзіце за рулём, а вашы дзеці — ў салёне, сыстэмай пабораў у школах і ВНУ. Але паколькі гэтага не паказваюць на БТ, значыць — гэтага няма. Экран вельмі зручны ня толькі палітынфарматар, але ж і навігатар па жыцьці.

Усё, што паказваюць, — можна. Можна гуляць у суперлято і выйграваць дарагія кватэры і шыкоўныя заходнія аўтамабілі (чамусьці іранскага «Саманду» сярод прызоў няма). Можна верыць у астралёгію, прывідаў і сканчэньне сьвету. Можна распавядаць пахабныя анэкдоты і галасаваць на «Эўравізіі» за Дзіму Білана. Канечне, калі вам кажуць, што трэба рабіць інвэстыцыі ў Беларусі альбо будаваць аграгарадкі — вы, калі ў вас нават ёсьць грошы, не абавязкова адразу кінецеся гэта рабіць. Але вы будзеце мець на ўвазе галоўнае — усё ста-біль-на. Таму можна займацца чым заўгодна, толькі не раздражняць начальства.

Тэлевізія — вялікі дзякуй ёй за гэта — паказвае нам ня тое, што мы хацелі б бачыць. (Гэта можна знайсьці ў інтэрнэце.) Яно паказвае нам тое, чым мы ёсьць на самай справе. Можа, некаму хочацца паглядзець фільм Вайды або паслухаць опэру Шнітке «Жыцьцё з ідыётам» ці мала што яшчэ. Можа, нехта ўявіў ужо сябе буйным навукоўцам, палітыкам, мастаком альбо таленавітым паэтам. Зірнуў на экран — і ўсё як рукой зьняло.

Як у савецкім анэкдоце: ...а вы, шаноўны слухач Іваноў, не прыкідвайцеся разумнікам — слухайце песьню «Валенкі».

На экране БТ нам, зразумела, не пакажуць Івана Шылу, як і Зьмітра Жалезьнічэнку. Ці Казуліна. Ці Мілінкевіча. І арт-шапакоўні з выставы Алеся Пушкіна не пакажуць. І гэтая «фігура змоўчваньня» таксама падкажа гледачу, што трэба рабіць і чаго ня трэба. Ня трэба шкадаваць Івана са Зьмітром, тым больш заступацца за іх. Якая вам справа да нетыповых прадстаўнікоў беларускага грамадзтва, гэтых маргіналаў, да «адмарожанай ап азыцыі»? Трэба зарабляць сваю капейчыну, укладаць грошы ў патрыманыя аўтамабілі ды слухаць песьню «Валенкі».

На шосты дзень стварэньня, як сказана ў Бібліі, Усявышні стварыў чалавека. А на 7-ы дзень пайшоў адпачываць і больш у чалавечую гісторыю ня ўмешваўся. 7-м днём за біблейскім часам лічылася субота. У хрысьціянскіх краінах днём адпачынку стала нядзеля. Цікава, што ў ЗША адлік новага тыдня часьцяком вядзецца не ад панядзелка, але ад нядзелі. Можа, таму сярод нобэлеўскіх ляўрэатаў пераважная большасьць амэрыканцаў? Яны проста скасавалі «цяжкі дзень» — панядзелак. У публічных школах ЗША дзеці ў суботу ня вучацца. А хай-скул (сярэднюю школу) там сканчаюць пасьля 18 гадоў.




Юлія Дарашкевіч

# «Беларусьфільм» здымае кіно пра Паўлічэнку

Сэрыял «Крапавы барэт» падаецца як стужка пра «беларускіх спэцназаўцаў, якія праяўляюць свае найлепшыя якасьці».

Год таму сцэнар Аляксандра Дэбалюка «Крапавы барэт» заняў трэцяе месца на конкурсе кінастудыі «Беларусьфільм». Паспалітай публіцы Дэбалюк вядомы як прадусар стужкі Андрэя Кудзіненкі «Акупацыя. Містэрыі». «Крапавыя барэты» далёкія ад забароненых містэрый. Гэта стужка пра «беларускіх спэцназаўцаў, якія праяўляюць свае найлепшыя якасьці». Крыніцаю натхненьня паслужыў Дзьмітры Паўлічэнка, зь якім Дэбалюк разам вучыўся ў Менскай суворапаўскай вучэльні.

«Ёсьць фільмы пра лекараў, лётчыкаў, дык чаму не пра спэцназаўцаў?» — казаў Дэбалюк пасьля падвядзеньня вынікаў конкурсу.

Спачатку здымкі карціны адкладаліся; студыя спасылалася на брак грошай — да таго ж перарабляўся сцэнар. Але ў чэрвені рэжысёр Андрэй Голубеў прыступіў да працы над чатырохсэрыйным фільмам. (Цікава, што раней рэжысёрам пазначаўся невядомы А.Войніч.) «Крапавы барэт» рэклямуецца як «першы айчынны прыгодніцкі баявік». На сайце кінастудыі інтрыгуюць, што «на здымкі далі сваю згоду некаторыя мэдыйныя пэрсоны, у тым ліку вядомы R'n'B выканаўца Стас Сацура. Прачытаўшы сцэнар, ён сам выбраў для сябе ролю. Сацура стане навабранцам Андрэем Дзянісавым. А яшчэ ён прапанаваў напісаць саўндтрэк для карціны».

На жаль, мы так і не дазналіся, дзе і чым слаўны сьпявак Сацура.

Затое расейскі актор Сяргей Селін (у «мянтоўскім» тэлесэрыяле «Вуліцы разьбітых ліхтароў» грае капітана Дукаліса) быў заўважаны на вучэньнях брыгады МУС Рэспублікі Беларусь. Байцы спэцназу здавалі экзамэн на «крапавы барэт»; у выпрабаваньні ўваходзіў крос і паласа перашкодаў, якую й фільмавалі студыйцы. «Дукаліс» **(на фота)** фарсіў у форме з выявай рысі — эмблемай часткі 3214, якой і камандуе падпалкоўнік Паўлічэнка.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

У іграным кіно дакумэнтальныя здымкі звычайна выкарыстоўваюць як сьвядомы аўтарскі прыём альбо з фатальнага недахопу грошай.

Рэжысёр Андрэй Голубеў — на сайце кінастудыі — прызнаўся: «Гэта будзе дынамічны маладзевы фільм зь вялікай колькасьцю складаных здымак». Здымкі мусяць праходзіць на Каўказе і ў Беларусі.

Андрэй Голубеў — выхаванец Міхаіла Пташука. Ягоная дэбютная карціна «Чаклун і Румба» на міжнародным чувакскім фэсьце ў горадзе Чабаксары, што праходзіў пад клічам «Патрыятызм — гэта стан душы» — атрымала прыз «За найлепшы дэбют». Ваенная мэлядрама пра патрыятычнага сапёра Чаклуна і ягоную аўчарку Румбу вылучаецца неахайнымі здымкамі і вытрыманая ў патасным стылі.

Другую карціну Голубева — чатырохсэрыйны «Крапавы барэт» — плянуюць завершыць сёлета.

**Андрэй Расінскі**




# Гравюра Горадні прадалася за 44 тысячы даляраў

За яе на варшаўскім аўкцыёне «Лямус» змагаўся таксама адзін беларускі бізнэсовец і прадстаўнікі Гарадзенскага музэю, але выкласьці такія грошы яны былі не гатовыя.

Стары Замак, мост цераз Нёман і ўсе цэрквы — манумэнтальная панарама Горадні паўстае на гэтым медзярыце 1568 г. Гравюра Цюнта памерам 36 на 102 см паказвае горад у часе прыгатаваньняў да Люблінскае уніі. На першым пляне маршалак Валовіч вітае пасольства цара Івана Жахлівага. У далечыні адкрываецца панарама места. Яе змаляваў у ліпені 1568 г. відавочца, Яна Адэльгаўзэр. А Матыяс Цюнт (1498—1572), знакаміты нюрнбэрскі медзярытнік, зрабіў гравюры. Гэта сапраўдны рарытэт: вядомыя ўсяго некалькі захаваных арыгіналаў гэтай працы. Ніводзін зь іх не знаходзіцца ў Беларусі.

Адна зь іх, з прыватнай калекцыі, выстаўленая на антыкварны аўкцыён у Варшаве (№21). Ён адбыўся 7 чэрвеня.

Пачатковая цана «Vera designatio urbis in Littavia Grodnae» — гэта поўная назва гравюры — складала 40 тысячаў злотых (18,5 тыс. даляраў). Продажная — амаль у 2,5 разу большая — 95 тыс. злотых.

За яе на варшаўскім аўкцыёне «Лямус» змагаўся таксама адзін беларускі бізнэсовец і прадстаўнікі Гарадзенскага музэю, але выкласьці такія грошы былі не гатовыя. Дырэктара музэю Юр'я Кітурку гарвыканкам упаўнаважыў таргавацца да мяжы 60 тыс. злотых.

У выніку гравюра трапіць у Нацыянальную бібліятэку Польшчы.

Затое беларускі калекцыянер, які пажадаў застацца невядомым, купіў на аўкцыёне сьціплы партрэт апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

**Мікола Бугай**

# Пра нашыя храмы

Кніга Сяргея Харэўскага «Культавае дойлідства Заходняй Беларусі 1915—1940 г.» прысьвечаная аднаму з найменш вывучаных этапаў разьвіцьця айчыннае архітэктуры — дойлідству Заходняе Беларусі, разьвіцьцё якога ішло асобна ад 1915 г., калі палова краіны была акупаваная войскамі кайзэраўскае Нямеччыны, да 1939 г. У міжваенны час у Заходняй Беларусі быў сапраўдны будаўнічы бум. Пра размах можна меркаваць па дзяржаўным пляне на 1938–39 год. Толькі ў Браслаўскім павеце аб'ектаў грамадзкага і сацыяльнага прызначэньня планавалася ўзьвесьці 144.

Важнай часткаю заходнебеларускае архітэктуры было будаўніцтва храмаў. У Заходняй Беларусі да 1939 г. дзейнічала 446 касцёлаў, 542 царквы, 387 сінагог, 14 манастыроў. Сьвятарскую паслугу выконвалі 617 каталіцкіх, 606 праваслаўных сьвятароў, 293 рабіны. Да 1939 г. у СССР налічвалася 50 тыс. каталікоў, пасьля далучэньня — 6,5 млн. Рэпрэсіі і атэістычная прапаганда спынілі канчаткова разьвіцьцё сакральнае архітэктуры ў 1940 г.

Кніга С.Харэўскага ўводзіць ва ўжытак малавядомыя дакумэнты і факты з гісторыі культуры Заходняй Беларусі. Напісаная жывой, вобразнай мовай, яна адрасаваная ўсім цікаўным да гісторыі беларускай і сусьветнай культуры.

**Ул.кар.**




**Харэўскі Сяргей. Культавае дойлідства Заходняй Беларусі 1915—1940 г.** — Вільня: Прапілеі, 2008

## СЬЦІСЛА

### У Наваградку музэй Кіта

Яго ўрачыста адкрылі 4 чэрвеня. Барыс Кіт быў выкладчыкам матэматыкі ў Беларускай гімназіі Наваградку ў ваенны час. Каб ня жыць у СССР, эміграваў на Захад. Заслужыў вядомасьць працай у амэрыканскай праграме асваеньня космасу. Музэй разьмясьціўся ў будынку былой беларускай гімназіі, а цяпер сярэдняй школы №1, дзе спадар Кіт вучыўся, а пазьней працаваў. Сам Кіт, якому ідзе 99-ты год, на ўрачыстасьць прыехаць ня змог.

### Пабудуюць армянскую царкву

Пра тое паведаміў старшыня армянскай рэлігійнай грамады Беларусі Андрэй Амбарцумян. Армянская абшчына Беларусі была створаная ў 1992 г., а армянская рэлігійная абшчына — у 2003 г.

### Зборнік аўдыёказак

Прэзэнтацыя аўдыёзборніка сэрыі «Беларускія народныя казкі» адбылася 8 чэрвеня ў менскім кінатэатры «Перамога». У запісе бралі ўдзел радыёвядоўца Тамара Лісіцкая, кіраўнік дзіцячага калектыву «Калыханачка» Людміла Рыжкова й музыка Алег Хаменка. Прэзэнтацыя сэрыі дыскаў прайшла пры падтрымцы Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЭФ) у Беларусі.

### Выйшаў дыск «Музыка Беларусі XIX ст.»

У складанцы прадстаўленыя творы Антона Абрамовіча, Міхала Клеафаса Агінскага, Канстанціна Горскага, Караля, Аляксандра і Міхаіла Ельскіх, Восіпа Казлоўскага, Станіслава Манюшкі, Камілы Марцінкевіч, Напалеона Орды, Антонія Радзівіла і Канстанціна Тызэнгаўза. Да дзьвюх плытак прыкладаецца кніжыца-вокладка з кароткімі біяграфіямі кампазытараў і іх партрэты.

### Новы лэйбл некамэрцыйнай музыкі

Беларусы заснавалі праект sgustokmusic.org. На яго сайце ўжо зьявіліся першыя дармавыя рэлізы й падкасты. Ідэя належыць братам-блізьнятам Дзянісу і Зьмітру Кавалёвым.

**МБ, АК, СП; «Менск-навіны», БЕЛТА, радыё «Свабода»**

# Састарэлая апазыцыя

Сярэдні ўзрост кіраўніцтва ўсіх партыяў, акрамя партыі БНФ, перавышае 50 гадоў. Піша **Дзяніс Мельянцоў**.


PHOTO.BYMEDIA.NET

Справаздачныя зьезды найбуйнейшых апазыцыйных партыяў Беларусі (АГП і БНФ) у гэтым і мінулым годзе, а яшчэ раней — падзеі 2006 г. і стварэньне «Руху «За Свабоду», зноў паставілі ў цэнтар увагі пытаньне пра канфлікт пакаленьняў унутры беларускай апазыцыі. Канфлікт гэты, на думку некаторых аналітыкаў, выяўляецца ў імкненьні больш маладога пакаленьня ў складзе палітычных партыяў уплываць на партыйныя рашэньні і прадстаўляць свае інтарэсы ў кіраўнічых органах партыяў, што натыкаецца на супрацьстаяньне старэйшай, больш кансэрватыўнай, генэрацыі палітыкаў.

Для таго, каб даказаць існаваньне канфлікту пакаленьняў у беларускай апазыцыі, неабходна спачатку даведацца, ці ёсьць выразны разрыў паміж пакаленьнямі ў апазыцыі. У гэтых мэтах было праведзена невялікае дасьледаваньне ўзроставага складу найбольш буйных і ўплывовых апазыцыйных партыяў — Беларускага Народнага Фронту, Аб’яднанай грамадзянскай партыі і Партыі камуністаў беларускай. Вось некаторыя вынікі гэтага дасьледаваньня.

**Табліца 1. Сярэдні ўзрост кіраўніцтва палітычных партыяў**

| | ПБНФ | АГП | ПКБ |
|---|---|---|---|
| Сярэдні ўзрост кіраўніцтва (старшыня, намесьнікі, кіраўнікі абласных структур) | 40,7 | 50,3 | 56,8 |
| Сярэдні ўзрост сяброў кіраўнічага органу (Сойм, Палітрада або ЦК) | 44,7 | 50,4 | 54 |

**Дыяграма 1. Узроставыя групы ў партыі БНФ**




**Дыяграма 2. Узроставыя групы ў АГП**




**Дыяграма 3. Узроставыя групы ў ПКБ**




Як паказваюць пададзеныя зьвесткі, сярэдні ўзрост партыйнай эліты дастаткова салідны, і ён павялічваецца пры пераходзе ад правага краю палітычнага спэктру да левага (у гэтую схему добра ўпісваецца і партыя БСДП(Г), сярэдні ўзрост кіраўніцтва якой складае 53,3 гады). Апошняе можа сьведчыць як пра непапулярнасьць сярод моладзі левай ідэалёгіі, гэтак і пра большую ўнутрыпартыйную дэмакратыю правацэнтрысцкіх партыяў.

Ва ўсіх разгляданых партыях дастаткова нязначную праслойку складаюць сябры партыяў векам ад 35 да 45 год. Гэта можа быць сьведчаньнем адсутнасьці пераемнасьці ў партыйнай традыцыі праз вымываньне вельмі важнай узроставай катэгорыі, якая складаецца з найбольш самастойных, прафэсійных і мэтаскіраваных людзей на піку сваіх творчых магчымасьцяў. З тых або іншых прычынаў партыйная моладзь, прайшоўшы «курс» сацыялізацыі ўнутры партыі і дасягнуўшы пэўных пасадаў, пакідае палітычную дзейнасьць для таго, каб рэалізавацца ў іншых сфэрах жыцьця. Такая сытуацыя назіраецца практычна ва ўсіх апазыцыйных палітычных партыях Беларусі.

Такім чынам, можна канстатаваць наяўнасьць разрыву пакаленьняў унутры беларускай апазыцыі. Асабліва гэты тэзіс справядлівы для Партыі камуністаў беларускай, дзе больш за 80% палітычнай эліты складаюць людзі, старэйшыя за 45 год. Прычыны разрыву пакаленьняў могуць быць самыя розныя: адсутнасьць бачных пэрспэктываў прыходу да ўлады ў краіне, немагчымасьць рэалізаваць сябе ўнутры партыі (у тым ліку і праз канфлікт пакаленьняў), зьмена жыцьцёвых прыярытэтаў, боязь рэпрэсіяў, адсутнасьць эфэктыўнай маладзевай палітыкі на больш раньнім этапе разьвіцьця партыі, што, у сваю чаргу, прывяло да зьніжэньня колькасьці сяброў партыі сярэдняга веку, і інш.

Разам з тым, разрыў пакаленьняў не заўжды павінен прыводзіць да канфлікту пакаленьняў. Хутчэй, да яго можа прывесьці такая канфігурацыя ўнутры партыі, калі старэйшае і маладзейшае пакаленьні маюць сувымерны колькасны склад і ўплыў унутры партыі і пры гэтым партыйная моладзь мае непрапарцыйнае прадстаўніцтва ў кіраўнічых органах палітычнай партыі. Канфлікт можа назірацца таксама пры наяўнасьці сур’ёзных супярэчнасьцяў у праграмах разьвіцьця партыі, прадстаўленых рознымі пакаленьнямі ўнутры партыі. У выпадку разгляданых партыяў мы такой канфігурацыі не назіраем.

Маладое пакаленьне прадстаўленае ў кіраўнічых органах апазыцыйных партыяў больш-менш прапарцыйна (што, аднак, не дае поўнага ўяўленьня пра ступень яго ўплыву на прыняцьце ключавых рашэньняў — гэта прадмет для больш шырокага і дэталёвага дасьледаваньня), не існуе кардынальнага разыходжаньня ў бачаньні партыйнай стратэгіі і разьвіцьця краіны. Да таго ж, маладзейшае пакаленьне партыйнай эліты прайшло сацыялізацыю ўнутры ўласнае партыі, што не дае падставаў чакаць ад яго кардынальна інакшых спосабаў вядзеньня палітычнай барацьбы і рэалізацыі партыйных задачаў.

Тую незадаволенасьць партыйным кіраўніцтвам, якая была артыкуляваная, у прыватнасьці, падчас апошніх справаздачна-выбарчых зьездаў партыі БНФ і АГП, варта, хутчэй за ўсё, аднесьці не да праяваў канфлікту пакаленьняў унутры гэтых партыяў, а да барацьбы разнастайных унутрыпартыйных груповак і асоб пры агульнай незадаволенасьці партыйнымі лідэрамі, якія не зьмяняліся ўжо на працягу многіх гадоў.

Сапраўдны ж канфлікт пакаленьняў выявіўся падчас падзеяў вясны 2006 г., і ў прыватнасьці падчас «Плошчы», калі пад уплывам электаральнай мабілізацыі і жорсткіх дзеяньняў улады адносна мірных дэманстрантаў пачалі ўтварацца групы супраціву, якія вельмі жорстка дыстанцыявалі сябе ад традыцыйнай партыйнай апазыцыі, якая, на іх думку, адказная за шматлікія правалы і паразы і ня здольная да сапраўднага супраціву. Прадстаўнікі гэтай новай хвалі супраціву акурат і ўяўлялі зь сябе зусім новую генэрацыю несыстэмнай апазыцыі, якая не пагаджалася са стратэгіяй апазыцыйных партыяў, з прынцыпамі іх дзейнасьці, не была носьбітам «партыйнай культуры» і мела адрознае бачаньне сытуацыі[1]. Гэтае пакаленьне ўяўляла відавочную пагрозу для традыцыйнай партыйнай апазыцыі, і таму гэты велізарны патэнцыял моладзевай актыўнасьці ня быў ніякім чынам выкарыстаны апазыцыйнымі партыямі і, пазьней, сышоў на нішто. Але ў выпадку рэалізацыі іншай стратэгіі, згодна зь якой арганізацыйная матрыца «старых» партыяў наклалася б на хвалю несыстэмнага і спантаннага моладзевага супраціву, дэмакратычныя сілы маглі б атрымаць нашмат больш магутны і актыўны рух, чым пазьней утвораны «Рух «За Свабоду».

Такім чынам, вынікі дасьледаваньня дазваляюць зрабіць выснову пра наяўнасьць разрыву пакаленьняў у беларускай сыстэмнай апазыцыі, які на сёньняшні дзень, аднак, не прыводзіць да канфлікту пакаленьняў

---

* Загаловак ад Рэдакцыі. Аўтарскі загаловак: «Зьмена пакаленьняў у беларускай апазыцыі: ці ёсьць канфлікт?»

[1] Больш падрабязна гл.: Мельянцоў, Дз. Спантанныя групы ў паслявыбарчы перыяд // Палітычная сфера. №7. С.32—41.

# Апазыцыі трэба перагледзець мэты

Працяг са старонкі 1.

### Вера ў Яго Вялікасьць Крызіс

У апошняй онлайн-канфэрэнцыі на радыё «Свабода» Мікола Статкевіч выказаў меркаваньне большасьці беларускіх апазыцыйных лідэраў, заявіўшы, што зьмены ў сёньняшняй Беларусі магчымыя толькі ў выпадку палітычнага крызісу падчас прэзыдэнцкіх выбараў. «Рашучыя дзеяньні паўтары тысячы дэманстрантаў ва ўмовах, калі ўлада захоўвае субардынацыю, немагчымыя, — сказаў Статкевіч. — Але ёсьць адна ноч у пяць гадоў, калі субардынацыя ўладаў, так бы мовіць, хістаецца. Гэта ноч палітычных цудаў. Гэта — ноч прэзыдэнцкіх выбараў».

Усе апошнія тактычныя крокі апазыцыі адпавядалі гэтаму стратэгічнаму прынцыпу. За час лукашэнкаўскага кіраваньня значныя фінансавыя, арганізацыйныя і інфармацыйныя рэсурсы былі кінутыя апазыцыяй галоўным чынам на тры палітычныя кампаніі — прэзыдэнцкія выбары 2001 і 2006 гадоў, а таксама рэфэрэндум 2004 году, што меў на мэце зьняць для Лукашэнкі абмежаваньне на колькасьць прэзыдэнцкіх тэрмінаў. Выбары ў нацыянальны сход у 2000 і 2004 гадах разглядаліся апазыцыяй як менш важныя, і ўжо зусім ніхто, відаць, не ўспамінае пра кампаніі па выбарах у мясцовыя саветы, якія Беларусь перажывала ў 1999, 2003 і 2007 гадах.

Ня дзіўна, што ў ходзе вышэйзгаданых кампаній па выбарах прэзыдэнта роля маладых актывістаў апазыцыі абмяжоўвалася зборам подпісаў, распаўсюджваньнем агітацыйных матэрыялаў і самае галоўнае — удзелам у вулічных пратэстах. Тым часам іх старэйшыя калегі прымалі рашэньні адносна размеркаваньня рэсурсаў і прадстаўлялі Беларусь за мяжой. У апазыцыйнай моладзі практычна не было магчымасьці праявіць уласныя палітычныя амбіцыі. З другога боку, парлямэнцкія і мясцовыя выбары давалі куды лепшыя магчымасьці для разьвіцьця мясцовых палітычных ініцыятываў і набыцьця палітычнага досьведу моладзевымі актывістамі, якія маглі прэтэндаваць на месцы дэпутатаў. Аднак іх старэйшыя калегі былі зацікаўленыя толькі ў сымбалічным удзеле ў такіх кампаніях (асабліва ў буйных гарадах), паколькі лічылі поўнамаштабны ўдзел у парлямэнцкіх выбарах, не гаворачы ўжо пра мясцовыя, пустой тратай часу і сілаў. Такім чынам, канфлікт пакаленьняў у беларускай палітычнай апазыцыі ўсё большаў і большаў — галоўным чынам дзеля сумнеўнай палітычнай стратэгіі, якая аддавала перавагу правядзеньню палітычных зьменаў зьверху перад разьвіцьцём нізавых ініцыятываў.

### Ці прайграе апазыцыя бітву за моладзь?

Гаворачы пра рэпрэсіўны характар лукашэнкаўскага рэжыму, мы павінны выразна ўсьведамляць, што яго апарат падаўленьня скіраваны амаль выключна на патэнцыяльна эфэктыўную антыўрадавую дзейнасьць у пэрыяд буйных палітычных кампаніяў, а таксама на тых грамадзян, якія спрабуюць данесьці «апазыцыйны вірус» да больш шырокіх сацыяльных слаёў. У астатніх адносінах культурнае і інтэлектуальнае жыцьцё Беларусі характарызуецца адноснай свабодай. Прынамсі, дзяржаўны кантроль над «апалітычнай» культурнай ды інтэлектуальнай дзейнасьцю ў недзяржаўным сэктары слабы. Іншымі словамі, жыцьцё ў сучаснай Беларусі далёкае ад затхлай і прыгнятальнай атмасфэры брэжнеўскага СССР.

Існуе цікавая аналёгія паміж палітычным кліматам у сёньняшняй Беларусі і Польшчы пачатку 1980-х, пасьля ўвядзеньня ваеннага становішча і забароны «Салідарнасьці». Польскія камуністычныя ўлады, трымаючы пад пільным наглядам чальцоў і прыхільнікаў «Салідарнасьці», у значнай ступені аслабілі свой кантроль у культурным і сацыяльным жыцьці. Такія двухаблічныя захады ў першую чаргу, відаць, былі закліканыя прадухіліць далучэньне да палітычнай дзейнасьці польскай моладзі ды ізаляваць апошнюю ад уплыву палітычнай апазыцыі. У 1980-я раптам была зьнятая забарона на разьвіцьцё айчыннай рок-музыкі, і стала намнога прасьцей атрымаць замежны пашпарт, каб выехаць за мяжу. Агульнай у той час была думка, што польскія камуністы сьвядома штурхаюць маладых людзей да пошукаў уцехі ў гарэлцы, сэксе, наркотыках і рок-музыцы альбо да эміграцыі — замест уключэньня ў палітычнае ці грамадзкае жыцьцё.

Сучасны беларускі рэжым, як выглядае, імкнецца насьледаваць такому падыходу. Маладыя беларусы, якія хочуць арганізаваць сетку назіраньня за выбарамі, перасьледуюцца паводле артыкулаў Крымінальнага кодэксу аб тэрарызьме, у той час як уступленьне ў праўдзяржаўны Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі прапагандуецца праз увесь час іх навучаньня і працоўнай дзейнасьці. У сваю чаргу, вядомыя беларускія рок-музыканты, зьяўленьне якіх на радыё і тэлебачаньні раней было забароненае, нечакана запрашаюцца ў прэзыдэнцкую Адміністрацыю, дзе атрымліваюць прапанову аб «амністыі» наўзамен адмовы ад удзелу ў апазыцыйных мерапрыемствах.

Наколькі пасьпяховая гэтая выбарачная палітыка бізуна і перніка? Некаторыя сацыялягічныя дадзеныя ўскосна паказваюць, што, магчыма, даволі пасьпяховая. Паводле апытаньня, праведзенага ў сакавіку Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў (НІСЭПД), які цяпер працуе ў Вільні, 64% беларусаў лічаць, што паляпшэньне эканамічнай сытуацыі ў іхнай краіне зьяўляецца больш важным, чым захаваньне незалежнасьці; 24% маюць процілеглае меркаваньне. Пры гэтым сярод рэспандэнтаў ва ўзросьце 18—29 гадоў гэтыя паказчыкі складаюць адпаведна 71% і 22%. НІСЭПД, які праводзіць грунтоўныя апытаньні грамадзкай думкі ў Беларусі двойчы ў год, робіць выснову, што гэтыя дадзеныя сьведчаць пра рост у беларускім грамадзтве «мэркантылізму» і «прагматызму» за кошт «патрыятызму».

Апазыцыя няспынна перасьцерагае, што палітыка Лукашэнкі прывядзе да эканамічнай, а затым і палітычнай анэксіі Беларусі Расеяй, але зьвесткі НІСЭПД паказваюць, што пераважная большасьць беларусаў не перажываюць з гэтай нагоды. Больш за тое, маладыя пакаленьні — сацыяльна больш мабільныя і лепш адукаваныя — здаецца, нават менш заклапочаныя лёсам нацыянальнай незалежнасьці, чым іхныя старэйшыя суайчыньнікі. Чаму?

Першым прыходзіць у галаву адказ, што Лукашэнку сапраўды ўдалося выгадаваць маладых прагматыкаў, якія больш турбуюцца пра свой страўнік, чым пра нацыянальны гонар. Па працяглым разважаньні даводзіцца таксама дапусьціць, што маладыя пакаленьні беларусаў, мабыць, ня лічаць магчымую страту незалежнасьці за Лукашэнкам, пра якую ўвесь час гавораць апазыцыя, рэальнай пагрозай для сваёй краіны ці для сябе асабіста. Іх больш хвалюе эканамічны спад, актуальны сёньня для многіх грамадзтваў — як аўтарытарных, так і дэмакратычных. У любым выпадку, зьвесткі НІСЭПД — гэта кепская навіна для апазыцыі з пункту гледжаньня пэрспэктываў пашырэньня яе ўплыву сярод моладзі.

### Патрэбна (як мінімум) новая мова

Чаму многія маладыя беларусы ўспрымаюць Лукашэнку як дабрадзея, а ня як тырана?

Перш за ўсё таму, што ён прапаноўвае моладзі нешта важнае і каштоўнае для яе ў абмен на палітычны канфармізм. Галоўнымі «падарункамі» рэжыму для маладых людзей зьяўляюцца бясплатная адукацыя, свабода перамяшчэньня (у тым ліку магчымасьць замежных паездак) і ўсё больш прывабныя пэрспэктывы працягу прафэсійнай кар'еры ў Беларусі, паколькі эканоміка павольна, але няўхільна перажывае «аўтарытарную» мадэрнізацыю.

Калі дзьве трэціны беларусаў лічаць наяўную палітычную сытуацыю бясьпечнай і стабільнай, апазыцыі варта перагледзець свае палітычныя мэты — ці прынамсі сваю мову, — калі яна жадае захавацца як уплывовая палітычная група, не гаворачы ўжо пра здабыцьцё той ці іншых рычагоў у сыстэме ўлады.

Мне здаецца, галоўнай перадумовай такога перагляду павінна стаць прызнаньне з боку апазыцыі, што Лукашэнка, пры ўсёй эксцэнтрычнасьці і дзікасьці яго палітычных манер і мовы, магчыма, усё ж закладае свайго роду падмурак, які перажыве яго праўленьне. Па сутнасьці, гэтым падмуркам зьяўляюцца палітычныя і эканамічныя інстытуты незалежнай дзяржавы. Прынамсі, цяпер ужо нікога ня трэба пераконваць, што сёньняшняя Рэспубліка Беларусь як мінімум ня горшая за ўчарашнюю БССР.

Калі такая пераацэнка адбудзецца, апазыцыйным партыям будзе прасьцей зьвыкнуцца з думкай, што барацьба за дэпутацкія мандаты ў мясцовых саветах або нацыянальным сходзе — ня менш важная справа, чым удзел у прэзыдэнцкай кампаніі. Беларуская апазыцыя можа паступова пазбавіцца ад сваёй палітычнай зьняверанасьці і паставіць сабе на службу таленты і энэргію ўсё больш прагматычных маладых пакаленьняў, якія хочуць лепшага жыцьця для сябе цяпер, а не для сваіх дзяцей і ўнукаў у прывіднай будучыні.

**Ян Максімюк**

аналітык і эсэіст. Нарадзіўся на Беласточчыне, этнічны беларус. Жыве ў Празе.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Іван Шыла: «Ніхто з маіх настаўнікаў не прагаласаваў за выключэньне»

Выключаны з школы хлопец з Салігорску шукае працу і спадзяецца вучыцца ў ЭГУ без атэстату.

11 чэрвеня восем юнакоў зладзілі акцыю салідарнасьці з Іванам Шылам. Маладзёны выйшлі да Міністэрства адукацыі з расьцяжкай «Школа для ўсіх». Так яны прастаялі каля пятнаццаці хвілін, а пасьля перадалі ў ведамства зварот у падтрымку хлопца. Літаральна за паўгадзіны да акцыі Іван Шыла адказаў на пытаньні «Нашай Нівы».

**«Наша Ніва»: Іван, справа з тваім адлічэньнем атрымала нейкае разьвіцьцё пасьля таго, як цябе не пусьцілі здаць апошні экзамэн?**

**Іван Шыла:** Найбліжэйшымі днямі мы падамо скаргу ў суд. Многія настаўнікі прасілі мяне гэтага не рабіць. Яны таксама жывыя, ёсьць нейкія несупадзеньні пры запаўненьні журналаў. Таму ў выпадку праверкі ў іх таксама могуць узьнікнуць дадатковыя праблемы. Фармальнай жа падставай для адлічэньня сталі пропускі. Аднак іншага шляху адстойваць свае правы няма. Так, часам замест школы я езьдзіў на суды да сваіх сяброў...

Працяг на старонцы 11.

## ТБМ дзякуе і просіць ахвяраваньняў на ўтрыманьне сядзібы

**Паважаныя сябры і прыхільнікі роднага слова!** Таварыства беларускай мовы выказвае словы ўдзячнасьці ўсім чытачам і журналістам «Нашай Нівы», якія аказалі нам матэрыяльную падтрымку ў цяжкую хвіліну. Дзякуючы ёй мы здолелі заплаціць за арэнду сядзібы ТБМ у Менску (вул.Румянцава, 13) па новым драпежніцкім кошце ў памеры 3 182 058 рублёў, а таксама 230 000 рублёў за арэнду сядзібы гомельскай абласной арганізацыі ТБМ.

Хочацца адзначыць шматлікіх ахвярадаўцаў і дабрадзеяў зь Менску, Горадні, Полацку, Наваполацку, Магілёва, Гомелю, Маладэчна, Жлобіну, Барановіч, Мазыра, Шаркаўшчыны, Глыбоччыны, Горак і іншых гарадоў і мястэчак Беларусі і замежжа.

Для тых чытачоў «Нашай Нівы», хто жадае далучыцца да нашых дабрадзеяў, паведамляем рахунак ТБМ: № 3015212330014 у Гардырэкцыі ААТ Белінвэстбанк, код 764. Імёны асобаў, якія адразу ахвяруюць 5000 рублёў ці болей, будуць друкавацца ў газэце «Наша слова».

**Толькі разам мы пераможам!**
**З павагай,**
**Старшыня ТБМ Алег Трусаў**

## Лізьні БРСМ

**Днямі ў продажы зьявілася марозіва «БРСМ-Маладзёжнае».** Вытворчасьць гэткага арыгінальнага ласунку наладзіў Гарадзенскі малочны камбінат (гандлёвая марка «Малочны сьвет»).

Нядаўна па горадзе пачаў езьдзіць аздоблены бээрэсэмаўскай сымболікай аўтобус. Гарадзенскія спажыўцы гадаюць, якім будзе наступны «камсамольскі» крэатыў: піва ці дзіцячае харчаваньне?

**S13**

## Пра Навумава

**Спадар Навумаў — самы непапулярны кіраўнік МУС за ўвесь час незалежнай Беларусі.** А каб даведацца, што гэта за чалавек, проста прачытайце ягоныя камэнтары ў газэце «На страже», у якіх ён распавядае пра сябе.

Менавіта яго міліцыянты вінавацяць у тым, што чалавек у форме замест выкананьня сваіх непасрэдных абавязкаў выконвае цяпер многія незразумелыя функцыі.

Міліцыянты, у масе сваёй, — самая апазыцыйна настроеная група людзей. Многія памылкова прыраўноўваюць гоблінаў Паўлічэнкі і некаторыя спэцаддзелы да ўсіх супрацоўнікаў МУС. А нехта ж ловіць злачынцаў... Міф аб вялізных заробках простага міліцыянта падтрымліваецца як самім рэжымам, так і апазыцыяй. Між тым менскі сяржант міліцыі ППС зарабляе 650—750 тыс., а сьледчы — 900—1 050 000.

У падразьдзяленьнях МУС Менску ад аховы да ДАІ вялікі недахоп людзей, у некаторых падразьдзяленьнях нестае цэлых ротаў. Таму ўжо замест супрацоўнікаў на ахову правапарадку нашых вуліц часам выводзяць зусім не падрыхтаваных салдацікаў з Унутраных войскаў, якія выконваюць функцыю пудзіла і ня могуць разабрацца ў простых пытаньнях.

Усе мерапрыемствы, якія праводзяцца Навумавым супраць алькагалізацыі насельніцтва, не дасягнулі вынікаў. Сюды ж можна аднесці гісторыю з флікерамі, зь якімі ўжо ўсё пачынае заціхаць. І адкажыце, навошта гэтыя флікеры трэба было набываць ад пэўнага вытворцы на грузавыя аўтамабілі?

Можна прывесьці яшчэ шмат прыкладаў, але сэнс адзін — МУС ня мае папулярнага гаспадара.

**Друг Колас**

## ВОДГУКІ

### «Хадзілі і будзем хадзіць» (№21)

Дзякуй Вам, жанчыны!
**Іван**

***

Дзякуй, што Вы ёсьць!
**Бацян**

### Асобы траўня (№21)

А дзе тэнар Юры Гарадзецкі, які перамог на найпрэстыжнейшым музычным конкурсе ў Бэльгіі? Чаму няма Сашы і Сірожы ў сьпісе і нашай самай галоўнай асобы?
**Rada**

***

Прапаную «асобаю траўня» прызначыць ноўтбук, які амэрыканцы адбілі ў лясах Эквадору.
**Кнехт**

### Гэта ня Рыё-дэ-Жанэйра (№20)

Цікава, што ў адрозьненьне ад астатніх краінаў, дзе чым вышэй у горы ці пагоркі жывеш, тым гэта больш прэстыжна і дорага, у Бразыліі ўсе наадварот. Самыя горкія фавэлы разьмешчаныя высока над горадам, адкуль адкрываецца выдатны від.
**вк**

***

Пра малпаў няпраўда, малпы ёсьць — прынамсі ў Рыё. А вось каб пабачыць калібры або Паўдзённы Крыж — трэба некуды выяжджаць.
**Ancalot**

### Яраслава Мудрага прызналі найвялікшым украінцам (№19)

Украіна шукае сваю гісторыю. Яна ім жыцьцёва неабходна, як і ўсім. Гісторыя — імунітэт нацыі супраць вынішчэньня. Нас (гісторыі нашага народу) як бы й не існуе інакш, як толькі аскаболка гісторыі Расеі, самага зашмальцаванага аскаболка, шэрага й занядбанага да такой ступені, што гэта дае «некаторым» падставы бачыць ягоную адпраўленасьць ад прадстаўнікоў асноўнага «кавалка праснака», і нават лічыць яго самастойнай адзінкай сусьветнай гісторыі. Украіна ня хоча сабе такога лёсу.
**Саянаў**

***

Яраслаў нікога не забіваў. На замову Яраслава варагі забілі Барыса. Галаву адрэзалі і паднесьлі Яраславу. А беднага і юнага Глеба забілі паганне ў Мурамскай зямлі.

Яраслаў не вінаваціў Сьвятаполка. Гэта зрабілі праваслаўныя манахі (бо Сьвятаполк быў жанаты з дачкою польскага князя Баляслава Харобрага, а тая прывезла з сабою біскупа, які хрысьціў тураўцаў у лацінскім абрадзе). Адным з гэтых манахаў быў знакаміты Нестар, які зьнішчыў папярэднія летапісы і напісаў Аповесьць мінулых гадоў. Вось так і прыліпла да беднага Сьвятаполка мянушка Акаянны.

Яраслаў быў слабак. Ягоны тата забіў Рагвалода, а Яраслаў, нават перамогшы Рагвалодавага ўнука Брачыслава, аддаў яму Віцьбеск і Ўсьвяты. Абы жыць з Брачыславам у міры.
**Анатоль Сідарэвіч**

### Беларусь перад Флемінгам прадстала ва ўсёй красе (№21)

Што тут гаварыць: Севера-Западная Карэя.
**Вэлдам**

### Івана Шылу выкінулі са школы (№21)

Са словаў самаго Івана, дырэктарка была супраць таго, каб пакінуць Івана ў школе і даць яму атэстат, як вырашылі ўсе астатнія настаўнікі. І сышла толькі таму, што не хацела несьці адказнасьць за рашэньне пэдагагічнага калектыву перад уладай. І сышла яна яшчэ 27 сакавіка, спачатку па хваробе, а потым проста не вярнулася на працу. І, як паведамляюць са школы, больш нікога ня звольнілі!

Настаўнікі на самай справе малайцы!
**Nira**

### Беларус заправіў машыну мабільнікамі (№20)

Ня так даўно злавілі жыхара Малараты таксама з мабільнікамі, канфіскавалі на суму больш чым $70 000.
**Ochra**

### Гавары са мной па-корнску (№21)

Вось так жывеш і ня ведаеш, як жыве брацкі корнскі народ :). Вось бы ўсе корнцы вывучылі беларускую мову, а мы іх мову ў адказ. Езьдзілі б у госьці адзін да аднаго, вечарыны ладзілі б. А то гэтую ангельскую задаўбала вучыць!..
**Воўка-гісторык**

***

Каб зьбіць ваш імпэт, паглядзіце ў сеціве сёе–тое па кельцкіх мовах. Ангельскае вымаўленьне засвоіць у параўнаньні з ірляндзкім ці валійскім — дзіцячая забава, я ўжо не кажу пра граматыку з усімі належнымі клясычным індаэўрапейскім мовам склонамі і чаргаваньнямі гукаў. Корнская мова мусіць быць блізкай да валійскай. Валійцы, тыя, для каго ўэльская родная і паўсядзённая, нават ладзяць спаборніцтвы па вымаўленьні, прынамсі тапонімаў.
**Алекс**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага абʼёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**



# Зьбяры «Кнігарню «Наша Ніва»



**Бабілёнская бібліятэка:** Замежная літаратура ў перакладах «Нашай Нівы».



**Алесь Кудрыцкі. Суд на Каляды.** Зборнік публіцыстыкі.



**Наталка Бабіна. Крыві не павінна быць відна**



**Наталка Бабіна. Рыбін горад.** Раман



**Паветраны шар**: беларускае мужчынскае апавяданьне



**Жанчыны выходзяць з-пад кантролю:** Беларускае жаночае апавяданьне



**Пётра Краўчанка. Беларусь на ростанях:** Нататкі дыпляматa і палітыка



**Андрэй Дынько, Андрэй Скурко. Беларусь за 10 падарожжаў.**



**Павал Севярынец. Лісты зь лесу.**



**Артур Клінаў. Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца**



**Валянцін Тарас. На высьпе ўспамінаў.**



**Сямён Печанко. У беларускім войску:** Падарунак прызыўніку.

Шукайце ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў



УЛАДЗЬ ГРЫДЗІН

# Сяргей Парсюкевіч: «А нас не зламаць»

Ліст палітвязьня.

27 траўня атрымаў № 19 «Нашай Нівы» ад 22.05.2008. Атрымліваў яе і раней, калі яшчэ быў у Менску ў СІЗА-1. Агромністы вам дзякуй за дапамагу і падтрымку, якую вы аказваеце мне і маёй сям'і. Бо ж у тым ліку і дзякуючы вашай газэце мы адчуваем такую ўвагу і клопат нашых землякоў.

А тут за кратамі, дзе інфармацыю можна атрымаць толькі слухаючы радыё і зь лістоў, атрыманьне «НН» мае значэньне, якое цяжка перааценіць. Гэта як глыток паветра для нырца.

Хацелася б падзякаваць усім, хто даслаў віншаваньні і пажаданьні на дзень народзінаў, але ня маю такой магчымасьці чыста тэхнічна — ня хопіць паперы і капэртаў. А яшчэ хачу перадаць сваю ўдзячнасьць тым людзям, якія праводзяць акцыі ў падтрымку палітзьняволеных, дапамагаюць нам маральна і нават матэрыяльна, не забываюцца пра нашых блізкіх. Дзякуючы гэтым Людзям прыходзіць упэўненасьць у тым, што зрабіў справу, патрэбную ўсяму Народу, і расьце перакананасьць, што сьцяг, які спрабаваў несьці, ня будзе кінуты ў бруд і растаптаны, а яго падхопяць іншыя, якія ўсталі замест мяне, расьце ўпэўненасьць у хуткай перамозе. А іначай і быць ня можа — Сьвятло і Праўда заўсёды ў выніку перамагаюць цемру і хлусьню. І для гэтай Перамогі, вядома ж, трэба добра папрацаваць і вытрымаць пэўныя выпрабаваньні. Ніхто й ня думаў, што шлях да лепшага жыцьця ў нашай роднай Беларусі будзе лёгкі і ўсланы кветкамі.

Да таго, што трапіў сюды, за краты, у нейкай ступені стаўлюся як да належнага. Гэта значыць, што ўлады «годна» ацанілі маю дзейнасьць. І тыя беззаконьне і бязладзьдзе, якія ім давялося выкарыстаць, каб мяне сюды засадзіць, яшчэ больш павялічваюць гэтую ацэнку. Гэта значыць, што дыктатура панічна баіцца такіх людзей, якія могуць адстойваць інтарэсы простага чалавека. Улады адчуваюць, што чым далей, тым больш народу ідзе за намі, улады адчуваюць сваю слабасьць і непазьбежны канец. Цяжкасьці, якія адчуваеш тут, за кратамі, пастаянныя спробы прынізіць чалавечую годнасьць тваю альбо людзей, якія знаходзяцца побач, праблемы з поштай і г.д., яны ж толькі загартоўваюць волю, робяць характар цьвярдзейшым, а мэты больш жаданымі. Гэта дадае і здаровай злосьці. Злосьці не да людзей па той бок камэры, а да сыстэмы, якая іх узгадавала. А іх нават шкада, так, мяркуючы па іх паводзінах, яны самі разумеюць сваю непаўнавартасьць.

Гледзячы на нашу моладзь, найлепшых людзей нашай Беларусі, гледзячы на тое, што яны робяць для зьвяржэньня дыктатуры, я разумею, што ў нашай Радзімы ёсьць будучыня, і гэта будучыня сьветлая, і яна за намі. А нас ужо не зламаць! Можна, вядома ж, зьнішчыць канкрэтнага чалавека, але на ягонае месца ўстануць дзясяткі, сотні, тысячы.

**Посьпехаў.**
**З пашанай,**
**Сяргей Парсюкевіч**

**P.S.** Прабачце за пэўны сумбур у лісьце. Мяне, калі перавялі ў мэдчастку турмы, зь нейкай, я так разумею, усім зразумелай мэтай пасадзілі ў камэру, дзе ў людзей паставілі альбо ставяць дыягназ «невменяем». Яны цяпер рэальна «актывізаваліся», і мне цяжка засяродзіцца. Але нават тут, у гэтай «спэцкамэры», людзі мяне разумеюць, падтрымліваюць і паважаюць. Вельмі шкада гэтых людзей… Ім месца ня тут.

**Ад Рэдакцыі:** Гэты ліст Сяргея Парсюкевіча быў атрыманы 6 чэрвеня. Але напісаны ён быў відавочна яшчэ да этапу ў Шклоўскую калёнію.

## НАПІШЫЦЕ ПАЛІТВЯЗЬНЯМ

**Парсюкевіч Сяргей Ягоравіч**

213004, Магілёўская вобл., горад Шклоў, ВК–17.

**Кім Андрэй Іванавіч**

213000 Магілёўская вобл., горад Бабруйск, вул.Сікорскага, 1, ВК–2, атрад 11.

**Казулін Аляксандар Уладзіслававіч**

211300 Віцебская вобласьць, Віцебскі раён, пас. Віцьба, ВК–3, атрад 1

# Іван Шыла: «Ніхто з маіх настаўнікаў не прагаласаваў за выключэньне»

**Працяг са старонкі 9.**

**«НН»: Наколькі адлічэньне было для табе чаканым?**

**ІШ:** Нечаканым было тое, што адбылося гэта перад апошнім экзамэнам. Бо звычайна адлічэньні адбываюцца яшчэ да экзамэнаў. Мне ж пэднарада дала дазвол здаваць. І тут былі скліканыя дзьве нечарговыя пэднарады. На год іх усяго тры, а тут за два дні — дзьве. Напярэдадні ноччу міліцыянты мяне затрымалі з налепкамі «Горад — наш». У школу прыйшоў пратакол затрыманьня. Перад настаўнікамі паставілі простую дылему: ці выганяюць мяне, ці іх. Выкладчыкі спрабавалі мяне бараніць, не ўдалося. Калі звольнілі дырэктарку і яе намесьніцу, яны пайшлі шляхам найменшага супраціву.

**«НН»: Адкуль такая ўвага да тваёй пэрсоны?**

**ІШ:** Гэта простае стварэньне пудзіла для ўсіх школьнікаў. Каб бачылі, чым гэта можа скончыцца. Вось не паедзеце вы нават у Польшчу па Праграме Каліноўскага, бо мы вам не аддамо атэстат. Зараз пра мой выпадак будуць расказваць на сходах ня толькі Салігорску: вось да чаго можа дакаціцца моладзь, калі ідзе ў апазыцыю.

**«НН»: Як ацэньваеш пазыцыю настаўнікаў?**

**ІШ:** Ёсьць розныя. Адны засталіся сапраўднымі людзьмі да апошняга, іншыя — проста апынуліся закладнікамі такога становішча. Калі чалавеку даводзіцца выбіраць між поўнай лядоўняй і мной, то ён, натуральна, абярэ першае, бо трэба карміць дзяцей. Тым больш у сувязі з рэформай адукацыі скарачаюць школьны пэрсанал. На пэднарадзе прысутнічалі чыноўнікі з гарвыканкаму, і галасавалі пры іх. Хаця з тых настаўнікаў, што выкладалі ў мяне асабіста, ніхто не прагаласаваў за выключэньне! Я ім дзякую. Яны ня проста галасавалі супраць, але і патрабавалі, каб на пэднараду запрасілі мяне асабіста, пыталіся, хто даў загад.

**«НН»: Адчуваеш салідарнасьць?**

**ІШ:** Канечне: аднакласьнікі, іхныя бацькі, нават выпадковыя людзі на вуліцы мне ціснуць руку. Тэлефануюць, пішуць лісты, на сайце vkontakte.ru расьпісалі мне ўсю сьцяну словамі салідарнасьці. Гэта прыемна.

**«НН»: На выпускны хадзіў?**

**ІШ:** Так, быў. Хаця бацькі, скажам, не пайшлі. Аднаклясьнікам уручалі атэстаты, граматы. Думаў, мяне адзначаць хаця б як добрага футбаліста, але і тут не. Так ні разу і не згадалі падчас афіцыйнай часткі. Ужо пасьля аднаклясьнікі ў мікрафон сталі выказваць мне словы падтрымкі і падзякі.

**«НН»: І што цяпер? Што з унівэрсытэтам?**

**ІШ:** Я зьбіраўся і зьбіраюся паступаць на завочнае ў ЭГУ на факультэт паліталёгіі. Спадзяюся, што ніяк не адаб'ецца. А ў вольны час пайду на працу — наймаўся класьці ў горадзе плітку. Дык не ўзялі. Буду шукаць. Хутчэй за ўсё, застануся пакуль у Салігорску.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

### 2 чэрвеня

**Менск**

Суд Цэнтральнага раёну Менску адмовіўся разглядаць пазоў лідэра Аб'яднанай грамадзянскай партыі **Анатоля Лябедзькі** наконт забароны яму на выезд за мяжу. У судзе яму параілі накіраваць свой пазоў у МУС. Нагадаем, А.Лябедзьку адмоўлена ў выезьдзе за межы Беларусі на падставе крымінальнай справы, распачатай з ініцыятывы Генпракуратуры ў 2004 г. Тады, пасьля яго інтэрвію праграме «Люстра» (тэлеканал «Россия») і публікацыі ў газэце «Народная воля», палітыка абвінавацілі паводле ч. 1 арт. 367 КК («Паклёп на прэзыдэнта»).

**Полацак**

Актывісты незарэгістраванага «Маладога фронту» ўзьнялі сьцяг Эўрасаюзу на ўрачыстасьці з нагоды адкрыцьця ў Полацку памятнага знаку «Геаграфічны цэнтар Эўропы». Міліцыянты затрымалі моладзевага актывіста **Мікалая Дземідзенку** і сканфіскавалі сьцяг. Пратаколу не складалі.

**Вушача**

Маладафронтаўцам **Кацярыне Салаўёвай** і **Алесю Круткіну** не давядзецца аплачваць штрафы памерам 30 базавых велічынь, якімі іх пакаралі 20 траўня ва Ўшачах (Віцебская вобласьць) за распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных дадзеных. Рашэньне судзьдзі скасавалі, бо адміністрацыйныя пратаколы на актывістаў складалі не міліцыянты, а кіраўніца ідэалягічнага аддзелу райвыканкаму **Вольга Карчэўская**.

**Горадня**

Кіраўнік Гарадзенскай абласной арганізацыі БСДГ (на чале з С.Шушкевічам) **Віктар Сазонаў** атрымаў ліст зь мясцовага ўпраўленьня юстыцыі. Партыйнай суполцы адмоўлена ў рэгістрацыі (у шосты раз). Гэтым разам упраўленьне юстыцыі прызнала нелегітымным устаноўчы сход суполкі.

### 3 чэрвеня

**Журналіст БТ прынясе прабачэньні**

Журналіст першага каналу тэлебачаньня **Юры Пракопаў** ў тэлефоннай размове з адвакаткай **Верай Страмкоўскай** папрасіў у яе прабачэньня за публікацыю недакладных зьвестак. Гэта адбылося пасьля таго, як спн.Страмкоўская паабяцала падаць на журналіста скаргу ў пракуратуру ці заяву ў суд, калі той не абвергне заяву, што адвакатка нібыта атрымлівала грант у пасольстве ЗША. Ю.Пракопаў, паводле словаў адвакаткі, паабяцаў абвергнуць зьвесткі і ў тэлеэфіры.

### 4 чэрвеня

**Менск**

На 10 сутак паводле арт. 23.34 КаАП («Удзел у несанкцыянаваным мерапрыемстве») быў арыштаваны грамадзкі актывіст **Вячаслаў Сіўчык**. Прысуд вынес судзьдзя суду Менскага раёну **Вячаслаў Тулейка**. Нагадаем, В.Сіўчыка затрымалі днём раней ва ўрочышчы Курапаты, дзе адзначаліся 20–я гадавіна з дня адкрыцьця праўды пра масавыя расстрэлы пад Менскам.

**Кобрын**

Кіраўніка кобрынскай суполкі партыі БНФ **Аляксандра Меха** папярэдзілі пра звальненьне з працы. Сам А.Мех зьвязвае гэта зь яго намерам удзельнічаць у парлямэнцкіх выбарах. Сп.Мех 14 гадоў працуе ў Кобрынскай управе магістральнага газаправоду «Белтрансгаз». 4 чэрвеня яго выклікаў начальнік управы **Ўладзімер Галошка**, каб паведаміць, што яго кантракт, які сканчаецца ў канцы чэрвеня, працягнуты ня будзе. Размова адбывалася ў прысутнасьці чалавека, які назваўся начальнікам мясцовага КДБ, але прозьвішча свайго не сказаў.

### 5 чэрвеня

**Горадня**

Суд Ленінскага раёну Горадні аштрафаваў кіраўнікоў абласных арганізацый Аб'яднанай грамадзянскай партыі і Беларускай сацыял–дэмакратычнай Грамады **Юр'я Істоміна** і **Віктара Сазонава** «за актыўны ўдзел у масавым несанкцыянаваным мерапрыемстве» (канцэрт польскага гурту Lombard, які адбыўся ў Горадні 2 траўня). Паводле рашэньня судзьдзі **Натальлі Козел** Ю.Істомін павінен заплаціць 50 б.в. (1 750 000 руб.), В.Сазонаў — 30 б.в. (1 050 000 руб.).

**Пухавічы**

Суд Пухавіцкага раёну разгледзеў справы настаўніц з пасёлку Дружны **Насты Паповай** і **Тацяны Дыльковай**. Настаўніцы ўдзельнічалі ў мітынгу жыхароў пасёлку, якія пратэставалі супраць будаўніцтва ў гэтай мясцовасьці заводу ядахімікатаў расейскай кампаніі «Аўгуст–Бел». На пачатку судовага паседжаньня Н.Папова заявіла аб невінаватасьці і запатрабавала, каб у судзе яе абараняў адвакат. Хадайніцтва задаволілі і суд над ёй перанесьлі на 11 чэрвеня. Т.Дылькову аштрафавалі на 10 б.в. (350 тыс. руб.)

**Менск**

А палове на восьмую раніцы ў Менску над мостам праз Сьвіслач недалёка ад плошчы Перамогі невядомыя вывесілі шэсьць бел–чырвона–белых сьцягоў. На наступны дзень да аднаго з аўтобусаў маршруту №100 быў прычэплены бел–чырвона–белы сьцяг з надпісам «Горад наш». Аўтобус праехаў са сьцягам ад прыпынку «Акадэмія навук» да плошчы Незалежнасьці.

### 9 чэрвеня

**Горадня**

Кіраўнічка непрызнанага беларускімі ўладамі «Саюзу палякаў на Беларусі» **Анжаліка Борыс** атрымала 1 400 000 руб. штрафу за арганізацыю несанкцыяванага мерапрыемства. Гэткім супрацоўнікі гарадзенскай міліцыі палічылі канцэрт польскага гурту Lombard 2 траўня.

**СП**

# Лёгкая перанасычанасьць футболам

Чэмпіянаты Эўропы і сьвету па футболе ўжо перасталі ўспрымацца на нашай частцы кантынэнту падзеямі доўгачаканымі і незвычайнымі, як тое было хаця б дваццаць гадоў назад. Тады топавыя спаборніцтвы былі адзінай магчымасьцю падзівіцца на гульню бразыльцаў, італьянцаў, немцаў і іншых чараўнікоў мяча. Каму ж не хацелася зазірнуць, хай і на імгненьне, за фіранку савецкага першынства зь яго «Пахтакорамі», «Памірамі» і матчамі на дамоўленасьць, пра якія ведалі ўсе, але ўсе маўчалі. Таму спаборніцтваў за першынство так чакалі.

Сёньня ж нават у самага звычайнага заўзятара з глухой беларускай вёскі ёсьць магчымасьць глядзець матчы Лігі чэмпіёнаў і Кубку УЭФА, а таксама ангельскую прэм'ер-лігу — наймацнейшую ў сьвеце. Яшчэ да пачатку гульні любы школьнік, што цікавіцца футболам, можа раскласьці па паліцах прыкладную схему на матч зборнай Францыі ці Галяндыі.

Вось і выходзіць лёгкая перанасычанасьць футболам. Нават баісься, што на Чэмпіянат Эўропы эмоцыяў можа не хапіць.

У Аўстрыі і Швайцарыі зноў няма беларусаў — нас там не было ніколі, таму і няма пэўнага расчараваньня. Хутчэй, выхад на першынство ўспрымаўся як падзея абсалютна знакавая.

Зрэшты, Бэрнду Штанге хочацца верыць. Ён пакідае надзею, што і наша каманда некалі будзе ў кампаніі наймацнейшых у Эўропе. Травеньскі спарынг зь немцамі толькі ўзмацніў такое ўражаньне.

Няма на чэмпіянаце і пачынальнікаў футболу — ангельцаў. Яны ў звышдраматычнай вырашальнай сустрэчы саступілі харватам, для якіх тая гульня ўжо нічога не значыла. Харваты ж ўвасобілі ў жыцьцё стары ангельскі прынцып «гуляць да апошняй хвіліны». А яшчэ кажуць, што славяне ня ўмеюць на футбольным полі біцца да апошняга.

Апроч нетрапляньня ангельцаў на чэмпіянат, іншых сэнсацыяў не было. Фаварытамі звыкла лічацца нямецкая «бундэсцім», італьянская «скуадра адзура», францускі легіён, а таксама лятучыя галяндцы. Зрэшты, ніхто не застрахаваны ад сэнсацыі, кшталту такой, якую чатыры гады таму паднесьлі грэкі. Эліны не былі мацнейшымі за сваіх супернікаў па імёнах, тэхніцы, моцы атакі. Проста яны канкрэтна ў той момант былі наймацнейшымі камандным духам і атрымалі заслужаную перамогу. Чым ня прыклад для беларусаў?

Сярод фіналістаў Эўра-2008 нашы суседзі расейцы і палякі. Але іх ніяк не аднясеш да фаварытаў. Хаця расейцы і хрabraцца, асабліва пасьля перамог хакейнай зборнай на Чэмпіянаце сьвету і Дзімы Білана на «Эўрабачаньні». Нейкая ўсеагульная патрыятычнага эўфарыя захапіла ўсходнюю суседку. Няўдача Гуусу Хідзінку будзе каштаваць дарагога.

Вынікі апытаньня на сайце газэты «Прэс-бол» паказваюць, што большасьць нашых суайчыньнікаў зьбіраецца перажываць за немцаў. Таксама цікавая акалічнасьць.

Варта нагадаць, што наступны Чэмпіянат Эўропы праз тры гады пройдзе літаральна ў нас пад бокам — у Польшчы і Ўкраіне. Тады ўжо і беларускія заўзятары адчуюць сябе паўнавартымі ўдзельнікамі гэтага сьвята. Калі, канечне, Украіна не пасьпее да таго часу ўвесьці візавы рэжым. Пакуль жа большасьці аматараў застаецца толькі ўзірацца ў тэлевізары і глядзець футбол зь нягеглымі камэнтарамі дамарослых майстроў слова. Як у такія моманты пачынаеш цаніць Уладзімера Навіцкага!

Цяжка чакаць, што першынство адкрые нам новых футбольных куміраў. Хаця б так, як было чатыры гады назад у Партугаліі з Ўэйнам Руні. Занадта добра мы ўжо ведаем усіх заяўленых гульцоў і іхныя магчымасьці. Хаця хто яго ведае, заўсёды хочацца верыць у казкі з цудоўнымі пераўтварэньнямі.

Наўрад ці хтосьці будзе спрачацца, што пяршынствы кантынэнту заўсёды больш цікавыя за сусьветныя. Тут няма выпадковых камандаў кшталту Трынідаду ці Саудаўскай Арабіі. А нешматлікасьць гульняў і плястычнасьць календару дазваляе спадзявацца, што гэтая лёгкая перанасычанасьць будзе пераадоленая. Бо нас чакае цэлыя тры тыдні сапраўды вартага відовішча. А лета ж рыхтуе нам яшчэ адзін падарунак у выглядзе Алімпіяды!

**Зьміцер Панкавец**

# Польскія магільшчыкі польскай зборнай

Нечаканыя ўлюбёнцы беларусаў — немцы — на старце Чэмпіянату Эўропы перамаглі сваіх геаграфічных суседзяў палякаў — 2:0. У каманды Яхіма Лева адчуваўся моцны запас трываласьці. Здавалася б, было жаданьне, забілі б болей, але хапіла ўсяго двух галоў.

Самае цікавае, што магільшчыкамі польскай зборнай сталі этнічныя палякі — Міраслаў Клозэ і Лукаш Падольскі. Першы аддаў дзьве галявыя перадачы, а другі двойчы забіў. Такія вось парадоксы лёсу.

Міраслаў Клозэ нарадзіўся ў невялікім Аполі ў сям'і футбаліста і гандбалісткі. Калі Міраславу было 14 гадоў, сям'я пераехала ў Нямеччыну. Пры канцы 1990-х пачаўся ўзьлёт бліскучай кар'еры нападніка. Асабліва раскрыўся футбаліст у складзе «Кайзэрслаўтэрну», а пасьля «Вэрдэру».

Менавіта тады перад Клозэ паўстала цяжкае пытаньне, якую нацыянальную каманду абраць — Польшчы ці Нямеччыны. Выбар спыніўся на апошняй. Ужо тады на адрас футбаліста палянцела шмат абвінавачаньняў. Нехта сьцьвярджаў, што Клозэ ня мае ніякай нямецкай крыві, а сапраўднае яго прозьвішча Клос, якое было падробленае, каб безь перашкод атрымаць прытулак у Нямеччыне.

У 2006 годзе форвард стаў найлепшым бамбардзірам Чэмпіянату сьвету, дзе ў сямі сустрэчах забіў пяць галоў. А зборная дзякуючы ягоным намаганьням ўзяла бронзавыя мэдалі.

Міраслаў Клозэ ніколі не адмаўляе сваіх польскіх каранёў. Ён часта наведвае на радзіме шматлікіх сваякоў. Кажа, што размаўляе зь імі папольску. Зрэшты, перад стартавым для сябе матчам Эўра—2008 Клозэ сьпяваў толькі адзін гімн, бо банальна ня ведае польскага.

Сям'я Лукаша Падольскага **(на фота)** у сваю чаргу пакінула родныя Глівіцы, калі будучаму форварду нямецкай зборнай было толькі два гады.

Найлепшыя футбольныя сэзоны Падольскі правёў у заштатным «Кёльне». У той час польскія газэтчыкі актыўна агітавалі галоўнага трэнэра зборнай Паўла Янася зьвярнуць ўвагу на таленавітага юнака. Аднак Янась толькі адмахваўся ад такіх дарадцаў. Запрашэньне ад немцаў не прымусіла сябе доўга чакаць.



Характэрна, што Прынц Польдзі, як называюць нападніка журналісты, апошнія два гады зусім не праяўляе сябе ў «Баварыі», зблышага палірую чы лаву запасных. Затое ў зборнай ён раскрываецца напоўніцу. Многія гадалі, каму ж аддасьць перавагу Леў, фармуючы асноўны склад. Гомесу, Кураны, Падольскаму, Нойвілу? Як высьветлілася, трэнэр паставіў на польскі дуэт, і не пралічыўся.

Цікава, што пасьля забітых галоў Падольскі не праяўляў асаблівай радасьці і трыюмфаваньня. Такім чынам ён дманстраваў сваю ляяльнасьць да Радзімы. А пасьля гульні яго цёпла віталі ў польскім фанацкім сэктары.

Увогуле, Лукаш ніколі ня страчваў сваёй нацыянальнай ідэнтычнасьці. У ягонай сям'і размаўляюць толькі папольску. Ды і ў адрозьненьне ад Клоз Прынц Польдзі ведае польскі гімн. «Польшча — частка майго сэрца», — прызнаўся пасьля гульні футбаліст.

Два найлепшыя форварды сёньняшняга нямецкага футболу нарадзіліся ў гарадах, якія разьмяшчаюцца між сабой на адлегласьці 80 кілямэтраў. Яны маглі праслаўляць польскі футбол, але лёс склаўся інакш. На Эўра-2008 амаль кожная каманда мае ў сваім складзе дзяцей мігрантаў. Такая яна, сёньняшняя Эўропа.

**ЗП**

# Для іх чэмпіянат ужо скончыўся



REUTERS

Увесь сьвет абляцелі здымкі форварда зборнай Швайцарыі Аляксандра Фрая, які са сьлязьмі на вачох сыходзіў з поля ў матчы адкрыцьця Эўра. Досыць бяскрыўднае сутыкненьне з абаронцам чэхам Грыгерам пры канцы першага тайму абярнулася насілкамі, надрывам унутраных зьвязак калена. І — да пабачэньня, Эўра!

«Хоць я й мужык, мушу прызнацца, што за апошнія дзве сутак праліў нямала сьлёз. Мае мары разбурыліся, але ніяк ня мары каманды. Апошнія дзьве ночы я амаль ня спаў. У жыцьці здараюцца падзеньні, пасьля якіх трэба выбіраць: ляжаць на зямлі ці зноў падняцца на ногі. Пераможцы вяртаюцца, і ў будучыні я дакажу сабе, што магу ўвайсьці ў іхны лік», — сказаў журналістам Фрай.

Магчыма, менавіта недахоп Фрая і не дазволіў швайцарцам забіць мяч у браму Пэтэра Чэха.

Зрэшты, Фрай змог згуляць цэлы тайм Эўра, іншым пашанцавала нашмат меней. Напрыклад, найлепшаму футбалісту сьвету 2006 году Фаб'ё Канавара. Ужо на першай трэніроўцы італьянцаў у Аўстрыі адбыўся фатальны эпізод для абаронцы. Пасьля сутычкі з К'еліні Канавара зваліўся з ног, а з стадыёну яго забрала ўжо «хуткая дапамога».

За матчам італьянцаў з галяндцамі Канавара назіраў з загіпсаванай нагой. Перад гэтым «скуадра адзура» згубіла яшчэ двух гульцоў абароны — Аляcандра Нэсту і Масіма Оду. З такога пункту гледжаньня 0:3 ад галяндцаў не выглядаюць так ужо нечакана.

Перад самым стартам першынства траўму калена атрымаў таксама Павал Пагрaбняк — адзін з найбольш пэрспэктыўных форвардаў зборнай Расеі. Паўла нібыта перасьледуе злы кон. Спачатку ён ня змог згуляць у трыюмфальным для «Зэніта» фінале Кубку УЭФА, а цяпер прапускае Эўра.

Ня будзе ў Швайцарыі і Аўстрыі й абсалютна культавых футбольных постацяў: нямецкага брамніка Кана, партугальскага плэймэйкера Фігу, гішпанскага бамбардзіра Рауля, непаўторнага Зыдана. Век ужо ня той. Чэмпіёны сыходзяць, а на іхныя месцы прыходзяць новыя.

**Падрыхтаваў ЗП**



Выпуск у Менскай Сувораўскай вучэльні.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Ірына Дарафеева праслявіла расейскую песьню ў Польшчы

На міжнародным конкурсе расейскай песьні ў Зялёнай Гуры праславіліся сьпевакі зь Беларусі. Ірына Дарафеева заваявала Гран-пры ў конкурсе «Гіт фэстывалю». Другое месца ўзяў гомельскі сьпявак Сяргей Якуш, трэцяе — расейская вакалістка Вэрона.

Фэстываль у Зялёнай Гуры нагадвае былы Фэстываль савецкай песьні, аднак арганізатары зазначаюць, што гэтае мерапрыемства ўжо ня мае палітычнага кантэксту.

## Загадкавае самагубства салдата

У адной з частак, разьмешчаных на тэрыторыі Менскага раёну, днямі загінуў салдат тэрміновай службы. Ён выкінуўся з вакна чацьвёртага паверху. Па факце гібелі вайскоўца ўзбуджаная крымінальная справа. Што ці хто падштурхнуў хлопца да самагубства, пакуль невядома.

## Маці Божая Жыровіцкая на верталёце

Амаль паўмесяца на дзяржаўнай мяжы Беларусі праходзіў хросны ход са сьвятыняй — жыровіцкім цудадзейным абразам Маці Божай. Сьвятой вадой былі асьвечаныя ўсе пагранзаставы і камэндатуры, пагранічныя пасты Віцебшчыны. Заключным пунктам маршруту сталі Паставы, куды абраз даставіў верталёт. Проста на аэрадроме адбыўся малебен.

## Халява скончылася, не пачаўшыся

Як аказалася ў апошні момант, для бясплатнага праезду ў аўтобусе №33, які пусьцілі замест мэтро на час рэканструкцыі «Кастрычніцкай», «няма юрыдычных падставаў». Паездка ў мэтро зь перасадкай зь лініі на лінію з панядзелка абыходзіцца ў тры разы даражэй. Трэба плаціць 1800 рублёў замест 600. Транспартнікі тлумачаць: бясплатных аўтобусаў у Менску няма.

## Другі лось за тыдзень

Першы раз на скрыжаваньні праспэкту Любімава і Газэты «Праўда» лася зьбіў таксіст. А ўжо на наступную ноч на кальцавую дарогу зь лесу выскачыў яшчэ адзін лось.

Гэта адбылося ля павароту на вёску Зацань. Зьвер стаяў на іншым баку, а пасьля нечакана скочыў праз парапэт і трапіў пад колы. Ад удару мікрааўтобусу лось загінуў на месцы. Кіроўца не пацярпеў, машына моцна пашкоджаная.

## На кастынг конкурсу «Міс Сьветлагорск» ніхто не прыйшоў

Гарадзкі конкурс прыгажосьці «Міс Сьветлагорск» можа не адбыцца з прычыны няяўкі кандыдатак. Дзяўчаты праігнаравалі адборачны тур. У 1990-я ад канкурсантак адбою не было, а апошнія гады назіраецца дэфіцыт: ледзьве набіраецца 15 чалавек, прычым пра строгасьць адбору гаварыць не выпадае.

## Мабільнае тэлебачаньне ўсё бліжэй да Беларусі

Мабільнае тэлебачаньне ў стандарце DVB-H запускаецца ў Эстоніі і Латвіі з 2009 г. У Эстоніі абанэнты мабільнага апэратара ЕМТ, змогуць праз свае тэлефоны глядзець сем тэлеканалаў. Стандарт DVB-H выкарыстоўваецца ў 12 гарадах сьвету, яшчэ 40 на падыходзе. Найбольшую папулярнасьць мабільнае тэлебачаньне мае ў Італіі, дзе за апошнія два гады зьявілася 500 тысяч карыстальнікаў DVB-H.

## Дзіцячае «Эўрабачаньне-2009» пройдзе ва Украіне

Месцам правядзеньня прапануецца зрабіць міжнародны дзіцячы цэнтар «Артэк». На арганізацыю дзіцячага «Эўрабачаньня-2009» прэтэндавалі таксама Беларусь і Сэрбія.

Сёлетні ж конкурс пройдзе ў горадзе Лімасол на Кіпры 22 лістапада. У ім возьме ўдзел рэкордная колькасьць краін — 18. Дэбютуюць Азэрбайджан, Ізраіль, Босьнія і Герцагавіна. Затое адмовіліся ад удзелу Швэцыя, Партугалія і Польшча.

## Гай Рычы робіць фільм пра Шэрлака Холмса

Аўтар знакамітых фільмаў «Карты, грошы, дзьве рулі» і «Вялікі куш» абвясьціў, што зьбіраецца зьняць для кампаніі Warner Bros новую стужку пра Шэрлака Холмса. Прычым фільм будзе не паводле знакамітых твораў Конан-Дойла, а паводле коміксаў. Прадусар, кажуць, «крыху перапрацаваў» характар «рыцара скрыпкі і піпкі» — дэтэктыў у яго ўжо не такі кансэрватыўны і часта адпраўляецца шукаць прыгодаў. Таксама цікава, што зробіць Гай Рычы з доктара Ватсана.

## Бэрлюсконі падараваў папу крыж з дыямэнтамі

Прэм’ер-міністар Італіі Сыльвіё Бэрлюсконі, якога ў Ватыкане прыняў папа Бэнэдыкт XVI, падараваў пантыфіку залаты нагрудны крыж з алмазамі і тапазамі. Папа прыняў Бэрлюсконі ўпершыню пасьля прыходу да ўлады яго правацэнтрысцкай кааліцыі ў выніку парлямэнцкіх выбараў 13—14 красавіка.

## Вакаліст U2 за стварэньне ЗША ў Афрыцы

Музыка, пацыфіст і грамадзкі дзеяч Бона заклікаў да стварэньня «Злучаных Штатаў Афрыкі». Пра гэта лідэр U2 заявіў падчас міжнароднай канфэрэнцыі па разьвіцьці Афрыкі.

Бона настойвае на тым, што стварэньне «агульнаафрыканскай ідэнтычнасьці» можа паспрыяць пераадоленьню канфліктаў між плямёнамі. У сваіх развагах Бона спаслаўся на прыклад «амэрыканскіх» ЗША.

## 86-гадовы галяндзец выйграў мільён эўра

Шчасьлівы білет жыхар Гаагі атрымаў задарма — падчас спэцыяльнага розыгрышу. На шалёныя грошы навасьпечаны мільянэр зьбіраецца... пераехаць з жонкай у дом для састарэлых. Таксама частку выйгрышу ён аддасьць сынам.

## На Кубе можна мяняць пол задарма

Гэткую палёгку, сьледам за правам карыстацца мабільнікамі і набываць DVD-прайгравальнікі, даў народу Рауль Кастра. За часам Фідэля была зробленая толькі адна апэрацыя такога кшталту (1988 г.), а пасьля іх забаранілі. І вось ужо 28 чалавек з 11-мільённага насельніцтва жадаюць зьмяніць пол. Прычым гэта нічога не каштуе, бо зьмена полу лічыцца на Кубе спосабам мэдычнай дапамогі. А мэддапамога там бясплатная. Сацыялізм.

## Індзейцам сіў вернуць іх зямлю

Управа нацыянальных паркаў ЗША разглядае магчымасьць перадачы часткі тэрыторыі парку Бэдлэндз (Паўднёвая Дакота) індзейцам сіў з племя аглала, якія спрадвеку там жылі. Гэты кавалак зямлі на 54 тысячы гектараў быў забраны ў індзейцаў у 1942 г. Улады далі 800 сіў два тыдні на выезд, а пасьля ператварылі мясцовасьць у артылерыйскі палігон. Па вайне зямля трапіла ў склад нацыяналнага парку, хоць фармальна заставалася ва ўласнасьці племя. Індзейцы шукалі праўды па судох, у 2000 г. самыя радыкальныя зь іх нават перасяліліся на адно з плято Бэдлэндзу. Але «канструктыўны дыялёг» пачаўся толькі ў 2006 г., калі дырэктарам парку стаў індзеец-дакота. Ён дабіўся для аглала вяртаньня зямлі ў МУС ЗША.

## Бога прызначылі старшынём каледжу

Старшынём новага Каледжу тэхналёгій і мэнэджмэнту на поўначы Індыі прызначылі індуісцкага бога Ханумана. На афіцыйных мерапрыемствах крэсла, прызначанае для яго, застаецца пустым. Індуісты вераць, што Хануман вельмі дужы і сьмелы. Ён умее перастаўляць горы і скакаць праз акіяны. Паводле легенды, некалі ён на чале арміі малпаў перамог дэмана Равану. З такім старшынём посьпех гарантаваны, лічаць у каледжы.

## Самы працавіты мільярдэр

Паводле рэйтынгу часопісу Forbes такім прызнаны Генэральны дырэктар кампаніі Microsoft Стыў Балмэр. Ён узначальвае карпарацыю, у якой працую 80 тыс. чалавек, а прыбытак перавышае 51 млрд даляраў. Яго ўласнае багацьце ацэньваецца ў 15 млрд даляраў.

Апошнія гады Балмэр змагаецца на рынку інтэрнэт-рэклямы з кампаніяй-канкурэнтам Google і прасоўвае новую апэрацыйную сыстэму Microsoft Windows Vista.

Але папулярнасьць ён набыў ня дзякуючы працоўным подзьвігам. Яго пазнаюць па манеры выступаць, празь якую ён атрымаў мянушку «хлопчык-малпа». Гэта, бадай, адзіны мільярдэр, які можа, скачучы па сцэне, гучна крычучы і прытанцоўваючы, чытаць імправізаваны рэклямны рэчытатыў. Усяго ў рэйтынгу Forbes разглядаліся 1125 багацеяў з усяго сьвету.

**СМ; паводле naviny.by, «Польскае радыё для замежжа», «Звязда», Westki.info, «Рэспубліка»**

# Тонкі водар і пасьлясмак

П'еса, створаная паводле «Народнага Альбому», выйшла сёлета асобнай кніжкай у Беларусі. На гэтым тыдні яе прэзэнтацыя пройдзе ў Менску. Увазе чытачоў «НН» — пасьляслоўе да кнігі. Піша **Лявон Вольскі**.

Неяк сонечным лютаўскім днём патэлефанаваў да мяне Міхал Анемпадыстаў і кажа:

— Прывітаньне, дружа.

На што я адказваю тым жа:

— Прывітаньне, дружа.

Мы зазвычай так вітаемся.

І пасьля гэтае завядзёнкі Міхал прапанаваў мне напісаць тое, што Вы цяпер чытаеце. Гаворыць, я зрабіў уступ, а ты, дружа, напішы заканчэньне. Колькі радкоў пасьля п'есы.

Я, натуральна, згадзіўся. Бо зь якой нагоды мне было адмаўляцца?

І вось сьцягнуў я з нэту Міхалаў «уступ» і гляджу, а ён напісаны аж у 1999 годзе! Дзесяць гадоў мільганулі, як адна грунтоўная пасьляканцэртавая вечарына (зь пераходам на раніцу), альбо, як цяпер прынята казаць, «after party».

За гэты час:

зьнік гурт «Крыві», зьявіліся шматлікія разнастайныя альбомы Зьмітра Вайцюшкевіча;

Вераніка Круглова амаль зусім зьехала ў Бэрлін;

N.R.M. з маладой нахабнай каманды пераўтварыўся ў чарговых мастадонтаў белрокСцэны;

Слава Корань працуе праграмным дырэктарам (калі не памыляюся) Эўрапейскага Радыё для Беларусі;

там жа працуе Сяргей Ахрамовіч;

Аляксандар Памідораў — на радыё «Свабода»;

Ірына Курапаткіна даўно жыве і працуе ў Вашынгтоне, у ААН;

зьявіліся гурты «Крамбамбуля», «Зэт», «Гарадзкія» і Petepaff. Іх стварылі ўдзельнікі «Народнага альбому»;

былі запісаныя супольныя музычныя праекты «Сьвяты вечар—2000», «Я нарадзіўся тут» і нявыдадзеная «Скрыпка дрыгвы» (на вершы У.Караткевіча).

Увогуле, шмат чаго зьявілася і шмат чаго зьнікла. Усяго не прыгадаеш, дый ня трэба.

Але варта зазначыць, што «Народны альбом» стаўся адной з галоўных музычных падзеяў Беларусі канца XX стагодзьдзя. Ён навучыў музыкаў калектыўнай працы (і яны доўга не маглі супакоіцца, выдаючы вышэйзгаданыя супольныя праекты), ён іх распрыгоніў у сэнсе стыляў і жанраў (ад імя «Крамбамбулі» дзякую за гэта!), пазбавіў тупаватае юнацкае адданасьці вялікай ідэі рок-н-ролу і пераўтварыў яе ў адданасьць беларускай культуры.

Канцэрты «Народнага» не падобныя адзін да аднаго. Гэта не застылая камлыга, якую нельга зрушыць зь месца. У працэсе перадканцэртавых рэпэтыцыяў песьні перапрацоўваюцца, пераараньжоўваюцца гэткім чынам, каб музыкам было цікава іх выконваць у дадзены момант, у пэўны адрэзак часу. За дзесяць гадоў праект сасьпеў, набыў новыя фарбы, тонкі водар і пасьлясмак.

Мікалай Пінігін так і не паставіў спэктаклю. Гэта зрабіў Зьміцер Колас са сваім ліцэем. Папросту на энтузіязьме ды імпэце. Шмат чаго добрага ў сьвеце робіцца дзякуючы гэтым рэчам.

Безумоўна, «Народны альбом» чакаюць наперадзе вялікія справы і зорныя часы. Стоадсоткава будуць створаныя відэа- і кінавэрсія гэтага праекту, ды-джэі будуць перарабляць песьні, створыцца комікс паводле п'есы і мультфільм…

Гэта тое, што будзе. Твор, у якім, насамрэч, мой удзел — мінімальны, у асноўным пісаў Міхал, працуючы на той час у фірме, якая гандлявала фарбамі. І вось ён у рабочы час на сваім працоўным месцы займаўся не непасрэднымі абавязкамі, а стварэньнем п'есы (як перад гэтым ствараў і тэксты песень — за тым жа сталом). Я збольшага дапамог апрацаваць, давесьці да ладу, надрукаваў і — наперад! — усё, як і любы творчы прадукт, зажыло сваім жыцьцём, пайшло ў свабоднае плаваньне.

А што на астачу? Ды нічога. Зараз патэлефаную да Міхала, павітаюся: «Прывітаньне, дружа!», пачую тое самае ў адказ і скажу: «Ну што, я напісаў тое, што ты прасіў. І выслаў. Лаві пасьляп'есьсе, дружа!»







**Анемпадыстаў М. Народны альбом: п'еса /** Міхал Анемпадыстаў, Лявон Вольскі; іл.: М.Анемпадыстаў. — Менск: Мэдысонт, 2008

# Трое з запасьнікоў

У Нацыянальным мастацкім музэі праходзіць выстава твораў Пабла Пікаса, Фэрнана Лежэ і Надзеі Хадасевіч. Піша **Сяргей Харэўскі**.

Творы трох розных творцаў, аб'яднаныя ў адной залі мастацкага музэю, рэпрэзэнтуюць «левы» кірунак эўрапейскага мастацтва. Яшчэ таго, сацыялістычнага, але не абцяжаранага горкай праўдаю расчараваньня. Таго, гуманістычнага й жыцьцярадаснага, цікаўнага да ўсяго, што славіць стваральны працоўны патас.

…Пікаса пашанцавала. У мастацтве і жыцьці. Па-буйному. Ягонае імя ўславілася яшчэ ў чэрвені 1901 г., калі славуты парыскі галерэйшчык Валар зрабіў на спробу пэрсанальную выставу дзевятнаццацігадовага мастака з Гішпаніі. І мела тая выстава посьпех. Гэтак адразу да яго прышчапілася слава нонканфарміста, гарэзьлівага імправізатара, які імкнуўся да самаабнаўленьня. Пры канцы 1930-х творчасьць Пікаса ўспрымалася ўжо як вызначальная частка мастацкай самасьвядомасьці эўрапейскага грамадзтва. Што б ні рабіў мастак, усё станавілася ўзорам для пераймаНьня. Ці амаль усё: так, на парыскай Усясьветнай выставе 1937 г. яго славутую «Герніку» не заўважылі. Бо Пікаса й мадэрністы — Кандзінскі, Кірыко, Мандрыян — змушалі думаць, «напружвацца», расшыфроўваць галаваломкі. А перадваенныя глядач шукаў іншага.

Пасьля Другой усясьветнай вайны міт Пікаса ўвабраўся ў сілу. Ён выжыў. Ён быў героем рэзыстансу, ён быў героем культуры. Паводле самога ж мастака, ён быў падобны да цара Мідаса: усё, да чаго ні дакранаўся, станавілася золатам. Золатам мастацтва.

Менавіта тады, у другой палове 1940-х, стары мастак захапіўся керамікаю. Гэта быў найлепшы час яго жыцьця: скончылася вайна, і ён быў чарговы раз шчасьліва закаханы. Гліна ад дотыку пальцаў ператваралася ў збаны, талеркі, вазы ці …у жанчыну. Вобразы каханых праходзяць праз усе работы Пікаса, нават нацюрморты і пэйзажы. Часам дасьледчыкі нават падзяляюць яго творчасьць на пэрыяды ў адпаведнасьці з спадарожніцамі. У кераміцы знайшла сваё адлюстраваньне апошняя каханая мастака Жаклін Рок.

Неабмежаваныя магчымасьці керамікі, яе фактуры, арганічная повязь зь дзікасьцю зямлі — сталі адным з найялікшых адкрыцьцяў Пікаса. У адрозненьні ад жывапісных, графічных і скульптурных твораў, керамічныя вывучаны менш, і кожная іх выстава стаецца файнай нагодаю для новых дасьледаваньняў. Часам у кераміцы паўтараюцца матывы графікі. Вось талеркі з выявамі галубоў, намаляваных па ўзоры знакамітай галубкі, або з адлюстраваньнямі жаночых галоваў, што трансфармуюцца ў галубак — амаль нязьменнымі яны перанесеныя з графічных аркушаў мастака.

Пікаса да канца сваіх дзён жыў і рабіў у Валёрысе, заклаўшы падваліны славы тамтэйшага керамічнага цэнтру. Яго паплечнікамі былі Ільля Зданевіч, сын беларускага інсургента-каліноўца і грузінскай князёўны (той самы, які адкрыў для сьвету імя й творы Пірасмані), Фэрнан Лежэ, мастак-камуніст, імпэтны й рамесны творца, у руках якога ажывалі і холст, і гліна, і смальта, ды яшчэ беларуска Надзея Хадасевіч, жонка Лежэ.

Праз шмат гадоў яна прывезла на Бацькаўшчыну іх творы. Дзякуючы ёй, у Нацыянальным мастацкім музеі захоўваецца 38 твораў Пікаса 1948—60 г. Гэта выдатная тыражная кераміка: блюды, талеркі, вазы, збаны, насыценныя пано. Кожны экзэмпляр створаны пры непасрэдным удзеле Пікаса.

Францускі мастак-камуніст Фэрнан Лежэ зазнаў уплыў Сэзана, кубістаў, футурыстаў і пурыстаў. Быў захапіўшыся канструктывізмам. Працаваў і ў кіно і ў тэатры і ў дэкаратыўным мастацтве. Лежэ стварыў арыгінальны стыль у выяўленьні чалавечых постацяў і прадметаў, што паслужыў для эпігонства ва ўсім *сацыялістычным лягеры*. Яго пэрсанажы, складзеныя з абагульненых, нібы мэталічных формаў, нагадваюць болей мэханізмы, чым жывых істотаў. Чалавечае цела разглядаецца як рэч. Твар, яго плястычная каштоўнасьць, — шар, сфэра без пукатых і ўвагнёных элемэнтаў. Ва ўяўленьнях камуністычных дзеячоў вось такія істоты павінны былі збудаваць новы сьвет роўнасьці. Час быў такі… Разам з тым, *індустрыйны стыль* мастака быў выкшталцоны. Лежэ магутна паўплываў на эўрапейскае і савецкае дэкаратыўнае мастацтва.

У 1924 г. Лежэ арганізаваў у Парыжы «Сучасную акадэмію», дзе прапагандаваў свае погляды на мастацтва. А ў 1927 г. вучаніцай «Акадэміі» стала беларусачка Надзя Хадасевіч.

Яна нарадзілася яна ў вёсцы Асецішчы, што пад Бегам'ем, у 1904 г. Яшчэ ў дзяцінстве захапілася маляваньнем. У 1919 г. уцякла з хаты ў Смаленск, дзе паступіла ў Дзяржаўныя вышэйшыя мастацкія майстэрні.

Там яна і вучылася ва Ўладзіслава Стрэмінскага й ягонай жонкі Кацярыны Кабро. На пачатку 1920-х Надзея Хадасевіч побач з рэалістычнымі карцінамі, выканала шэраг працаў у духу супрэматызму: «Прэс-пап'е» (1918 г.), «Пачатак руху. Узьлёт-1» (1922 г.). Акурат у прадстаўленых на менскай выставе яе работах знайшлі адлюстраваньне ідэі Малевіча, зь якімі мастачка пазнаёмілася падчас навучаньня ў студыі Стрэмінскага. Гэтым эстампам блізу стагодзьдзя, а яны па-ранейшаму вабяць чысьцінёю колеру, формы і думкі. Бадай, для нас гэта найкаштоўнейшая часьціна экспазыцыі, што ілюструе эвалюцыю нашага мастацтва.

У 1922 г. Хадасевіч зьязджае з Смаленску ў Варшаву, скарыстаўшыся правам уцекачоў з Заходняе Беларусі. Два гады яна працавала пакаёўкаю ў польскай сям'і й была мадзісткаю ў капялюшных майстэрнях. Уваднача́сьсе займалася ў Акадэміі мастацтваў і вывучала варшаўскія музэйныя зборы.

У 1924 г. выйшла замуж за Станіслава Грабоўскага, беларуса, студэнта варшаўскае Акадэміі мастацтваў, ды зьехала зь ім у Парыж. Там яны разышліся. Другім мужам Надзеі стаў Фэрнан Лежэ.

У 1920—30-я яна шмат дапамагала яму ў манумэнтальных і дэкаратыўных працах, павялічвала ягоныя эскізы, асыставала ў Акадэміі. Лежэ-Хадасевіч наладзіла выданьне часопіса «Сучаснае мастацтва», што выходзіў на дзьвюх мовах: францускай і польскай. Яе эсэ й артыкулы ёсьць выбітнай крыніцаю для вывучэньня гісторыі і тэорыі мастацтва (у тым ліку й беларускага) міжваеннае эпохі.

У гады Другое сусьветнае вайны Надзея ўступіла ў Таварыства дапамогі фронту. Падчас акупацыі Францыі працавала ў падпольлі, распаўсюджвала ў Парыжы ўлёткі партызанаў. У 1944 г. яна ўступіла ў Саюз савецкіх патрыётаў і ў Саюз дапамогі былым ваеннапалонным, зладзіла выставу-аўкцыён мастакоў удзельнікам Рэзыстансу. Акцыя прынесла ажно 3 млн франкаў на карысьць Чырвонага Крыжа й Саюзу савецкіх патрыётаў. На адкрыцьці X зьезду Кампартыі Францыі ў 1945 г. экспанаваліся яе манумэнтальныя партрэты сяброў ЦК, выкананыя паводле гуашаў Фэрнана Лежэ.

Зразумела, чаму асоба Надзеі Лежэ-Хадасевіч была гэтак прыязна ўспрынятая ў СССР. Яна карысталася тут выключнай папулярнасьцю, сябравала з брэжнеўскай міністаркай культуры Фурцавай. Першая кніга яе ўспамінаў выйшла ў Маскве ў 1978 г. На падставе ўражаньняў ад вояжаў у СССР яна напісала безьліч палотнаў — «Калгасьніца», «Таджыцкія музыкі» і г.д. Надзея Лежэ даравала савецкім музэям жывапісныя працы мужа й свае палотны. Таксама яна падаравала беларускім школам больш за 2000 якасных рэпрадукцыяў карцінаў Люўру, што склалі спачатку вялікую перасоўную выставу, якую на пачатку 1970-х вазілі па гарадах і вёсках БССР.

І цяпер, дзякуючы колішняй рупнасьці Надзі Хадасевіч, мы маем магчымасьць убачыць у Менску часьціну таго вялікага сьвету *левага* мастацтва Эўропы сярэдзіны XX ст., што натхняла пакаленьне нашых бацькоў. Тое, што выстаўлена сёньня ў адной толькі залі, дэманструе часьцінку калясальнага скарбу, які перахоўваецца ў Нацыянальным мастацкім музэі. І застаецца балючае пытаньне — куды, у якія цёмныя шафы ізноў палягуць гэтыя дзвонкія й жыцьцядайныя творы, пасьля 23 чэрвеня, калі скончыцца выстава?

## ВЫСТАВЫ

### Дзіцячы малюнак

**У Музэі гісторыі і культуры Беларусі (вул.Маркса, 12) да 13 ліпеня** працуе выстава дзіцячага малюнка «З надзеяй у будучыню», прымеркаваная да Дня бежанцаў.

### Generation To Go

**У кавярні «City Bar» (вул.Куйбышава, 48) да 4 ліпеня** працуе выстава маладых фатографаў зь Беларусі, Расеі і Нямеччыны «Generation To Go». Удзельнікі выставы прапануюць зірнуць на сьвет вачыма пакаленьня, на долю якога прыпаў распад Савецкага Саюзу альбо аб'яднаньне Нямеччыны. Уваход вольны

### Швэдзкія фотавыставы

**Да 29 чэрвеня ў галерэі «Сьвет фота» (вул.Прытыцкага, 10)** працуе выстава знакамітага швэдзкага фатографа Енца Ластхейна «Белае мора — чорнае мора», а **ў Музэі сучаснага мастацтва (пр.Незалежнасьці, 46) з 14 чэрвеня да 5 ліпеня** працуе выстава «Балянсуючы паміж Стакгольмам і Менскам».

### Тыдзень нацыянальнага кіно ў Горадні

**Да 15 чэрвеня ў трох кінатэатрах Горадні** пройдуць Дні кіно Беларусі, Расеі, Украіны, краін Балтыі, Закаўказьзя і Польшчы. У рэпэртуары — 21 фільм. Асаблівасьцю фэсту стане Дзень нацыянальнага анімацыйнага кіно, які будзе праводзіцца ўпершыню. 15 чэрвеня ў кінатэатрах Горадні будуць ісьці працы беларускіх, расейскіх і ўкраінскіх аніматараў.

## КАНЦЭРТЫ

### Зьміцер Вайцюшкевіч

**19 чэрвеня ў «Графіці» (зав. Калініна, 16)** канцэрт Зьмітра Вайцюшкевіча. **Пачатак а 20-й.**




## ІМПРЭЗЫ

### Пленэр «Легенда зь пяску»

«Легенда зь пяску» трывае! Гэтым летам яна будзе з гліны. Пленэр пройдзе ў Менску. На вул.Матусевіча, насупраць унівэрсаму «Кунцаўшчына», за мостам стаіць гара, парослая асінавым гаем. На ёй будзе ўзьведзены касьцёл Сьв.Яна Эвангеліста. Дык жа пачнем будаўніцтва касьцёла пад гарой скульптурай «Малітва сьвятога Яна Эвангеліста»! Калі адбудзецца акцыя? На дні сьв.Яна Хрысьціцеля, гэта значыць на Купалу. У суботу рана **21 чэрвеня** пачынаем. А ў нядзельку далепім. Прыходзьце з фота- і відэакамэрамі, вёдрамі, гумовымі ботамі, у жоўтай вопратцы, але самае галоўнае—вазьміце з сабой родную мову. Кантакты: (029) 955-92-04 (Гэнік), 312-54-71 (Валя).

**ГЛ**

### Сьвята паэзіі

**21 чэрвеня менскі парк «Dreamland» (вул. Арлоўская, 80) з 14-й да 18-й** ладзіць сьвята паэзіі з удзелам Анатоля Вярцінскага, Сяргея Законьнікава, Міхася Скоблы, Галіны Дубянецкай, Алеся Пашкевіча, Зьмітра Вішнёва, а таксама бардаў Сержука Мінскевіча, Яраша Малішэўскага.

### Помнік Папу і канцэрт у Лучаі

**15 чэрвеня (нядзеля) у парафіі сьв.Юды Тадэвуша ў вёсцы Лучай (Пастаўскі раён)** адбудзецца асьвячэньне помніка Бэнэдыкту XVI і ўрачыстая імша. Удзел бярэ біскуп Уладзіслаў Блін. Падзея прымеркаваная да візыту ў Беларусь Дзяржсакратара Папы кардынала Тарчызіо Бэртонэ. **Пачатак а 16.00.** Пасля асьвячэньня адбудзецца канцэрт народнай песні.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Трыё з Бэльвілю» і «Кухар-злодзей»

У менскім кінатэатры «Цэнтр-Відэа».

**Трыё з Бэльвілю** (Triplettes de Belleville)

Францыя — Бэльгія — Канада — Вялікабрытанія, 2003, каляровы, 78 хв.

**Рэжысэр:** Сільвэн Шамэ

**Прызы, фэсты:** 2 намінацыі на «Оскар», 18 узнагародаў і шчэ 20 намінацый

**Жанр:** Анімацыйныя прыгоды

**Адзнака:** 9 (з 10)

Чэмпіён — маленькі хлопчык, які рыхтуецца да сусьветнае вэлягонкі Тур-дэ-Франс. Але невядомыя выкрадаюць Чэмпіёна. Бабуля Суза з сабачкам Брунам выпраўляецца на пошукі ўнука. Героям дапамагае трыё з Бэльвілю — эксцэнтрычныя бабулькі, сьпявачкі зь м'юзік-холу. Ці адолеюць яны злую францускую мафію?

Сакавіты гратэск, любоўна зьняты францускімі аўтарамі. Бабулькі, якія глушаць жабак дынамітам, патлівы сабачка, падступныя мафіёзі, упарты Чэмпіён. Штодзённая лірыка, складзеная з жэстаў і недарэчнасьцяў. Трыюмф эўрапейскае анімацыі пад трапную музыку Бэнуа Шарэ.

**Кухар-злодзей** (C(r)ook)

Нямеччына — Аўстрыя, 2004, каляровы, 108 хв.

**Рэжысэр:** Пэпэ Данкарт

**Ролі выконваюць:** Генры Хюбхен, Морыц Бляйбтрой, Карына Харфух, Надзея Брэніке

**Жанр:** «Чорная» крымінальная трагікамэдыя

**Адзнака:** 6,5 (з 10)

Оскар, які стаміўся працаваць на венскага крымінальнага аўтарытэта, вырашае выдаць кніжку «Сакрэты». Гэта недаспадобы яго босу, хаця Оскар проста захапляецца кулінарыяй — і марыць падзяліцца рэцэптамі. Напісаньне і друк кнігі будуць ісьці пад стрэлы й мафіёзныя разборкі.

Дасьціпная нямецкая трагікамэдыя з кулінарна-крымінальнымі жартамі, каханьнем, непаразуменьнем, запечанымі й ўваскрэслымі бандытамі.

Гэтую кулінарыю пад кулямі трэба глядзець толькі на поўны страўнік.

**Андрэй Расінскі**

# Сьмяротнікі з волі МУС

ЛЕВЫМ ВОКАМ



Міліцыя не пусьціла маладафронтаўца Івана Шылу ў школу здаваць экзамэн. Прычым тут палітыка? Іду ў заклад на пляшку піва, што супрацоўнікі МУС проста перадухілялі ДТЗ. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

*Запіс перамоваў супрацоўнікаў салігорскай міліцыі ад 6 траўня.*

**Першы голас:** Алё, алё! Я Крэдытны рэйтынг. Бабруйск-Арэна, прыём! Зараз жа выйдзіце на сувязь!

**Другі голас:** Крэдытны рэйтынг, гэта Бабруйск-Арэна, прыём. Што такое?

**Першы голас:** Вуліцай Казлова ў напрамку да школы № 4 на вялікай хуткасьці рухаецца нейкі аб'ект. На радары — 3 км у гадзіну. Прабіце ягоны памер ботаў па базе дадзеных.

**Другі голас:** Давай памер.

**Першы голас:** 43 з паловай. Белая красоўка 5-га году.

**Другі голас:** Ёсьць! Вучань Іван Шыла!

**Першы голас:** Ты разумееш, што будзе, калі парушальнік на такой хуткасьці правьецца ў школу?! Тым больш там цяпер экзамэны... дзеці, жанчыны... Давай да школы!

**Другі голас:** Чаму сам не затрымаў?

**Першы голас:** Нерэальна дагнаць. Ведаеш, якая ў нас тэхніка? А ў таго зуха новыя матузкі. Глядзі, што ён творыць? Ні на што не рэагуе, падразае мінакоў, ходзіць па сустрэчным тратуары. Беспрадзел па поўнай! Выстаўляй жывы шчыт! Тармазі мінакоў, якія цяпер на тратуары, і давай усіх у адну лінію перад школай. Яму іх ніяк не абысьці.

**Другі голас:** Ты што? Гэта ж жывыя людзі! А там — ліхач! Я не магу вось так рызыкаваць жыцьцём простых людзей!

**Першы голас:** Слухай, Бабруйск-Арэна. Ну, дапусьцім, пратараніць ён якогась небараку. Ну, будзе ў таго нэрвовы шок альбо колькі пераломаў. Ну, прасочыцца гэты факт у газэты. Ну, выйдзе артыкул. Міністар на гэта ўсё адно скажа, што мы дзейнічалі ў межах кампэтэнцыі.

**Другі голас:** А ты падумаў пра тое, што ў людзей з шчыту шок можа выклікаць фэномэн нэрвовага ціку. Ты падумай, якая будучыня чакае чалавека ў нашай краіне, які замест «прэзыдэнт» кажа «прррээээээзззыыызызыздддддннннннт»?

**Першы голас:** Пофіг! Лічы, што гэта загад, — рабі жывы шчыт.

**Другі голас:** Як чэсны міліцыянт я сам буду жывым шчытом перад уваходам у школу!

**Першы голас:** Ты што там, на пасту марку ЛСД ліжаш? Гэта ж небясьпечна! У цябе ж сям'я! Абдумайся!

**Другі голас:** Позна! Бывай, таварыш.

Памятайце вашага Бабруйск-Арэну! Ведайце, што ў момант, калі злачынца тараніў жывы шчыт у маёй асобе, я ўзгадаў словы міністра Навумава — трэба памятаць пра гонар мундзіру.

**Першы голас:** Толькі ня гэта! Не-е-е-е!.. Чаму ты маўчыш? Бабруйск-Арэна, прыём, ты дзе? Не-е-е-е!!!

*Маўчаньне.*

**P.S.:** Дзякуючы мужнасьці супрацоўніка МУС прарыў ліхача ў школу ўдалося перадухіліць. Дзеці і настаўнікі былі выратаваныя. Сам герой з нэрвовым цікам часова знаходзіцца ў рэабілітацыі, аднак відавочна ідзе на папраўку. Слова «прэзыдэнт» ён ужо можа вымаўляць як «пр-р-рэ-э… з-зы… д-д… дэнт».

### І ў мастах шчасьце

Славуты Бруклінскі мост **(на фота)** у Нью-Ёрку сьвяткуе ў гэтым месяцы 125-годзьдзе. У ангельцаў ёсьць Стамфардзкі мост, у французаў — мост Мірабо, у чэхаў — Карлаў мост, кітайцы будуюць у Шанхаі найдаўжэйшы мост у сьвеце. А што ў нас?

Па-першае, цэлы горад – Масты. Па-другое, маем славуты гарадзенскі Замкавы мост ад Старога замку да Новага, які помніць яшчэ Сьцяпана Батуру. Захаваўся ў Горадні і Стары мост празь Нёман, што таксама адзначыў ужо сваё стагодзьдзе. Самы доўгі мост у Беларусі — над Прыпяцьцю й злучае Мазыр з Калінкавічамі. Ёсьць славуты Чырвоны мост у Полацку, дзе ў кастрычніку 1812 г. адбылася лютая сеча за горад паміж французамі і расейцамі. Пасьля драўляны мост быў чырвоным ад крыві, і вада ў Палаце стала такога ж колеру. Цяпер яго замянілі на бэтонны, але назва ацалела.

На месцы старажытных мастоў у Менску стаяць новыя. Той, што злучае Ніжні горад і Траецкае прадмесьце (вул.Багдановіча), здаўна называюць Хлусавым. Назву атрымаў ён у далёкім XVI стагодзьдзі. Мост на вуліцы Янкі Купалы зваўся Плябанскім, а на вуліцы Першамайскай — Вясёлым (здагадайцеся, чаму). Кожны зь іх хавае старадаўнія паданьні й вялікія гісторыі.

**СХ**



REUTERS


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ЖЫТЛО**

**Прадам** аднапакаёвую кватэру (цагляная хрушчоўка) па вул.Якуба Коласа ў Менску: 2-і паверх, тарцавая, да столі 2.68, вокны ў двор, балькону няма. Патрэбны рамонт. Т.: (029) 910-21-86, да 23.00

**Дзьве дзяўчыны** (доктар і перакладчыца з ангельскай і нямецкай) жадаюць здымаць жытло (адна- ці двухпакаёвую кватэру) на доўгі час у Менску. Разгледзім усе варыянты і прапановы. Тэлефануйце, калі ласка, (029) 733-25-30 (Кася), (029) 625-82-96 (Надзея)

**ПРАЦА**

**Капітальны рамонт** энцыкляпэдый, слоўнікаў і падобных выданьняў. З рэстаўрацыяй або поўнай заменай пераплёту і залатым цісьненьнем. Т.: (209) 396-17-20

**Шукаю падпрацоўкі**, зьвязаныя зь беларускай мовай (кампутарны набор, пераклад, рэдагаваньне). Т.: (029) 198-32-51

**Дапаможам падрыхтаваць** тэксты розных жанраў, пераклад, віншавальныя вершы, рэдактура, выданьні. Т.: ы(029) 753-91-96, alesknigi@mail.ru

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101-03-24. Юрась

**Якасны набор**, рэдагаваньне тэкстаў на беларускай мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101-03-24. Юрась

**ВЯСЕЛЬЛЕ ПА-БЕЛАРУСКУ**

Тэл.: 7846313 (МТС); 9117887 (Velcom). Наста


# Ня ўсё ў жыцьці апошні раз

**Каб штотыдзень атрымліваць газэту,**

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перакладу дакладна і разборліва назначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

КВІТАНЦЫЯ

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір М.П.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**У Думе і каля Думы.** 1-ае засяданьне. Быў малебен, а потым пелі «Божа, цара храні». Сацыял-дэмакратаў і «левых» дэпутатаў пры гэтым не было.

**Як ваююць з п'янствам у Англіі.** Калі паліцыя пабачыць п'янага чалавека на вуліцы, дык зараз вядзе яго ва ўчастак. Калі гэты ягамосьць кажа, што ён саўсім цьвярозы, дык павінен сказаць два вельмі трудныя словы: «джэнэрал-консьцітушыанал» і «тэрыторыал-армі», а ўжо нарэшце дастаць рукой да вялікага пальца нагі. Калі хто кепска вытрымае гэты экзамэн, дык плаціць у гарадзкую касу 10 шылінгаў (каля 5 руб.).

**«Наша Ніва». №22. 1908**


Наша Ніва

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**


© **НАША НІВА**.

Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 301220628001 4 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 12.06.2008.

Замова № 3113.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.